Падпісацца на «Народную Волю» можна ў любы дзень
у любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку».

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 90 (4342)

13 лістапада 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ЗДАРЭННЕ

У мінскім гандлёвым цэнтры «Арэна-Сіці» абвалілася частка столі





Здарэнне адбылося ўчора, 12 лістапада, а 15-й гадзіне.

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях паведамілі, што абрынулася перакрыцце столі на плошчы 150 квадратных метраў.

Відавочцы распавялі, што столь абвалілася на кветкавы павільён, у якім у той момант знаходзіліся дзяўчаты-гандляркі. Адразу пасля здарэння іх хутка выцягнулі з-пад абломкаў мужчыны, наведвальнікі цэнтра.

«Ахова спрацавала вельмі хутка. Адразу ўсіх наведвальнікаў эвакуіравалі з гандлёвага цэнтра», – распавялі сведкі здарэння tut.by.

Вядома, што пацярпела 24-гадовая дзяўчына, прадавец кветкавага кіёска. Яе стан медыкі ацанілі, як сярэдняй ступені цяжкасці. З папярэднім дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма» яна шпіталізавана ў Гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі Мінска.

Раней гандлёвы цэнтр "Арэна-Сіці" належаў бізнесмену Юрыю Чыжу, але ў 2016 годзе, калі ў яго ўзніклі праблемы з праваахоўнымі органамі, адышоў «Белаграпрамбанку».

НАДВОР'Е

Месцамі галалёд

На гэтым тыдні чакаецца пасмурнае, без сонца надвор'е. Сёння пераважна без ападкаў, днём +7…+10°C, а ўжо ў сераду, паводле прагнозаў сіноптыкаў, дождж, мокры снег. Па ўсходняй частцы краіны месцамі галалёд, наліпанне мокрага снегу. Ноччу -4…+3°C, па захадзе +4…+7°C, максімальная днём ад -2°C па ўсходзе да +9°C па захадзе краіны.

15 лістапада, у чацвер, умовы надвор'я ў асноўным будзе вызначаць вільготная няўстойлівая паветраная маса. Месцамі дождж і мокры снег. Ноччу -2...+5°C, днём ад -2°C па ўсходзе да +8°C па захадзе краіны.

ВИЗИТ

В Беларусь едет Ильхам Алиев

Об этом вчера шла речь на встрече Александра Лукашенко с послом Азербайджана в Беларуси Латифом Гандиловым.

Основным поводом для встречи с дипломатом главы государства назвал предстоящий визит в Беларусь Ильхама Алиева, сообщает пресс-служба белорусского лидера. *«У нас есть о чем поговорить, есть масса вопросов. Хотя должен сказать, что фундамент наших отношений набирает прочность»*, – сказал А.Лукашенко.

В официальном сообщении отмечается, что с начала года белорусско-азербайджанский товарооборот увеличился более чем в три раза по сравнению с аналогичным периодом прошлого года.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ



Рэйкі Андрэя Караля вядуць у тупік

Пра міжнароднае супрацоўніцтва ў Беларускім дзяржаўным універсітэце дбалі заўсёды. Памятаю, як мае аднакурснікі выязджалі на практыку то ў Енскі ўніверсітэт (тагачасная ГДР), то ў Тбіліскі, то ў Рыжскі. Што замежны накірунак для флагмана беларускай навукі прыярытэтны і сёння, пацвердзіў і нядаўні візіт новапрызначанага рэктара Андрэя Караля ў Маскоўскі ўніверсітэт імя Ламаносава. Пратакол аб сумесных магістарскіх праграмах, супольны для абодвух універсітэтаў Дзень дружбы, анлайн-абароны дысертацый… Здавалася б, усё цудоўна, узаемавыгадна і варта пахвалы. Каб не адно "але"... Вярнуўшыся з Масквы, Андрэй Кароль зрабіў дзіўную заяву па выніках сваёй камандзіроўкі. Цытую ў арыгінале: *"Речь идет о синхронизации взглядов на очень многие вещи, ведь у нас общая история. И это согласование во многом отсекает какие бы то ни было иные трактовки исторических событий"* ("Советская Белоруссия", 18.10.2018).

Як гэта разумець? Якога блёкату ў гарбату беларускаму рэктару падсыпаў яго маскоўскі калега Віктар Садоўнічы? Ці ў Андрэя Караля, які яшчэ нядаўна кіраваў Гродзенскім універсітэтам, галаваскружэнне ад поспехаў? Дарэчы, за ім у Гродне, кажучы словамі расійскага класіка, даўно *"дурная слава шелестела"*. Асабліва пасля таго, як з ГрДУ былі вымушаны сысці па ідэалагічных прычынах вядомыя гісторыкі Вячаслаў Швед, Святлана Куль-Сільверстава, Іна Соркіна, Генадзь Семянчук і Андрэй Чарнякевіч. Звальнялі іх, Андрэй Кароль паказаў, што да гісторыі ў яго падыход дужа своеасаблівы.

Ад гэтай рэктарскай своеасаблівасці павінен ужо прыйсці ў роспач як мінімум гістфак БДУ. Бо як гэта – захаваць адналькавыя з расійскімі гісторыкамі трактоўкі гістарычных падзей? Задача, трэба прызнаць, проста невырашальная. Ну, напрыклад, хто для Беларусі Кастусь Каліноўскі? Нацыянальны герой, кіраўнік вызваленчага паўстання, яго імем і партызанскія атрады называлі, і вуліцы. А хто Каліноўскі для Расіі? Мяцежнік, дзяржаўны злачынца, асуджаны і павешаны на мураўёўскай шыбеніцы. Якую трактоўку рэктар Кароль прапануе лічыць адзіна правільнай?

Ці другі прыклад. Нядаўна Расія адзначала дзяржаўнае свята – Дзень адзінства. Прыпадае ён на 4 лістапада, бо ў гэты дзень у далёкім 1612 годзе "Масква была вызвалена ад палякаў", як тлумачаць расійскія СМІ. Але насамрэч гаспадарылі тады ў Маскве не палякі, а ліцвіны-беларусы. Скажам, камендантам захопленага Крамля быў рэферэндарый ВКЛ (дарадца канцлера) Аляксандр Корвін-Гансеўскі, яго змяніў палкоўнік войска ВКЛ Мікалай Струсь, а дадатковае войска ім на падмогу вёў сам вялікі гетман Ян Кароль Хадкевіч. Гэта тады Ян Пётр Сапега ў якасці трафея прыхапіў у Крамлі вялікі залаты кубак, які расійцам удалося вярнуць толькі ў 1831-м, разграміўшы ў *Северо-Западном крае* чарговае паўстанне... Дык вызваленне ад каго гатовы святкаваць беларус Андрэй Кароль, чарговым разам прыехаўшы ў Маскву? Атрымліваецца – ад беларусаў...

А якую адзіную з расіянамі трактоўку прапануе рэктар БДУ для вядомай Бітвы пад Оршай? Альбо – для вайны ВКЛ з Масковіяй 1368–1372 гадоў? Альбо – для вайны ВКЛ з Масковіяй 1534–1537 гадоў? Альбо – для яшчэ 10 аналагічных войнаў, якія спусташалі нашы землі ў XV–XVIII стагоддзях?

Магчыма, фізік па адукацыі Андрэй Кароль пра такія войны нават не чуў. Але ж яны былі. Дастаткова разгарнуць трохтомную энцыклапедыю "Вялікае Княства Літоўскае" – там пра згаданыя войны напісана без усякіх "адзіных трактовак".

А як паводле ўказаннеў рэктара будуць трактаваць у БДУ графа Мураўёва? Як вешальніка ці як "решительного усмирителя Края"? А генералісімуса Суворава? Як непераможнага палкаводца ці ката, які расстрэльваў з гармат касцюшкаў? А спалены Пятром І Магілёў беларускія студэнты будуць таксама лічыць "возвращением отторженных земель"?

Падобныя прыклады можна прыводзіць бясконца. Проста дзіву даешся, як чалавек на такой адказнай пасадзе не разумее, што ніякай аднолькавай трактоўкі гісторыі ў сумежных незалежных дзяржаў не бывае. Гэта тычыцца не толькі Беларусі і Расіі. Хіба Польшча і Украіна на падзеі, апісаныя ў "Патопе" Генрыка Сянкевіча, глядзяць з аднаго званіцы? Зусім не. А туркі з армянамі Арарат аднолькава трактуюць? Таксама не. Любы народ выпрацоўвае *сваю* версію гісторыі, па-народнаму кажучы, кожны кравец сваім кроем кроіць. І альтэрнатывы гэтаму чалавецтва яшчэ не прыдумала.

Справаздача рэктара БДУ пасля паездкі ў Маскву апублікавана ў "Советской Белоруссии" пад кідкім загалоўкам "Проложили рельсы". Цяжка пакуль сказаць, якія цягнікі і куды паедуць па тых рэйках, але беларускую гістарычную навуку яны адназначна прывядуць у тупік.

БЛІЦ

Прадстаўнік Канстанцінопальскага патрыярха пры Сусветнай радзе цэркваў архіепіскап Іоў (Геча) у інтэрв'ю Украінскай рэдакцыі Бі-Бі-Сі не выключыў магчымасці надання аўтакефаліі Беларускай царкве – калі папросяць царква і дзяржава.
"Народная Воля" вырашыла звярнуцца да нашых чыноўнікаў, прадстаўнікоў праваслаўнай царквы і адмыслоўцаў з пытаннем:

Ці хутка наступіць той час, калі Беларуская царква атрымае аўтакефалію?

Леанід Гуляка, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (не даслухаўшы пытання):

– Я не займаюся Канстанцінопальскай царквою, я займаюся заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Усё, да пабачэння…

Андрэй НАВУМОВІЧ, старшыня пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў (не выслухаўшы пытання):

– Прабачце, я вельмі заняты. Усяго вам добрага!

Сяргей Лепін, протаіерэй, старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы:

– Ну, пры пэўных умовах і на Марсе аўтакефальная царква можа з'явіцца, тым больш калі гэта вырашыць Канстанцінопаль! Але тут, на маю думку, пытанне ў іншым: а ці будуць такія ўмовы, наогул, ці папросяць аб гэтым дзяржава і Царква? Шчыра кажучы, я не хачэў бы займацца філасофскім прагназаваннем будучыні, бо рэальных падстаў для гэтага на сённяшні дзень я не бачу.

На мой погляд, трэба зараз як мага менш спекуляваць вакол падобных тэм і паменш "карміць троляў". Бо чым больш скандалаў будзе наконт гэтага, тым больш адмоўных наступстваў атрымаецца ад раз'яднання, якое адбылося паміж Канстанцінопалем і Масквой. І я маю на ўвазе адмоўныя наступствы менавіта ў нашым, беларускім, грамадстве. Мы зацікаўлены ў тым, каб беларуская праваслаўная супольнасць захавала сваю еднасць, а таму і ў тым, каб вернікі не шукалі нагод для сварак і спрэчак. Таму кажу, што варушэнне гэтай тэмы зараз, у гэты час – не тое, што спрыяе Беларускай царкве ды яе будучыні, як бы хто не сабе ні ўяўляў. Давайце маліцца, каб Гасподзь усё ўправіў.

Аляксандр Шрамко, святар:

– Гэтае пытанне залежыць не столькі ад царквы, колькі ад дзяржавы. А паколькі нашы ўлады залежаць ад Расіі, то ўсё тут зразумела…

Але асабіста я лічу, што аўтакефалія – гэта не тая мэта, да якой трэба імкнуцца, што менавіта аўтакефалія выратуе Беларускую царкву, зробіць яе лепшай і г.д. Таму што застаецца фактычна тая ж структура і застаюцца тыя ж людзі. Пачынаць трэба з прыходаў, з людзей, з іх усведамлення сваёй адказнасці, з будавання грамадзянскай супольнасці ў царкоўных межах. Тады ў царкве, магчыма, адбудуцца сур'ёзныя змены.

Максім ГАЦАК, рэдактар хрысціянскага інфармацыйнага партала krynica.info:

– Адказ на гэтае пытанне, на мой погляд, цалкам залежыць ад беларускай улады, бо на дадзены момант інтарэс актыўнай часткі беларускіх вернікаў у аўтакефаліі ёсць. І ёсць зацікаўленасць у некаторай часткі праваслаўных святароў, што пацвердзілася яшчэ ў 2014 годзе, калі мінскія святары актыўна галасавалі за наданне хаця б аўтаноміі Беларускай праваслаўнай царкве. Ёсць кананічныя ўмовы, па якіх, дарэчы, зараз ідзе працэс надання аўтакефаліі Украінскай праваслаўнай царкве, а раней была атрымана аўтакефалія Польскай праваслаўнай царквой. І ў Беларусі, дарэчы, будзе значна прасцей, чым, напрыклад, ва Украіне, атрымаць аўтакефалію, бо ў нас на дадзены момант няма канкуруючых структур, ёсць толькі адна Беларуская праваслаўная царква, у той час, калі ва Украіне тры галоўныя праваслаўныя царквы.

Але ці ёсць такі інтарэс у цяперашняй нашай дзяржаўнай улады, якая эканамічна, палітычна і духоўна падпарадкавана Маскве, бо сама Беларуская праваслаўная царква пайсці супраць улады не зможа?

Ігар МЕЛЬНІКАЎ, гісторык:

– На вялікі жаль, сёння рэлігія выкарыстоўваецца палітыкамі ў якасці ідэалагічнай зброі. І ў гэтай сувязі актуальнай з'яўляецца праблема адсутнасці незалежнай праваслаўнай царквы ў Беларусі.

Ці часта мы чуем беларускую мову на службах у айчынных праваслаўных храмах? Не. Ёсць праблемы і з разглядам падзей беларускай гісторыі мясцовымі праваслаўнымі святарамі. Часта падзеі мінуўшчыны падаюцца не з беларускіх пазіцый, а з заходнерускіх, вялікадзяржаўных. І гэта транслюецца "ў народ". Такім чынам, Касцюшка і Каліноўскі ператвараюцца ў "польскіх агентаў", уніяцтва – у схізматызм, а нацыянальныя сімвалы беларусаў бачаца праявамі апазіцыі да дзеючай улады.

Калі беларусы зразумеюць, што царква павінна быць беларускай, тады і можна будзе казаць пра аўтакефалію. Інакш мы рызыкуем "растварыцца" ў так званым "русском мире", згубіць сваю ідэнтычнасць і, самае галоўнае, незалежнасць Беларусі.

P.S. Трэба адзначыць, што з просьбай адказаць на пытанне, якое сёння вылучана ў бліц-апытанне, "Народная Воля" звярнулася да многіх праваслаўных святароў з розных рэгіёнаў Беларусі, аднак усе яны ўстрымаліся ад каментарыя і папрасілі навят не ўзгадваць іх імёны. *"Ёсць такія тэмы, на якія для карысці ўсіх лепш памаўчаць"*, – такім быў пасыл святароў.

Марыя ЭЙСМАНТ.

З НАГОДЫ

Юрый МЕЛЯШКЕВІЧ:

«Гэты знак мы чакалі 30 гадоў…»

Днямі ў Курапатах усталявалі памятны знак ахвярам сталінскіх рэпрэсій, а ўчора даўладкоўвалі тэрыторыю вакол помніка.

Грошы на манумент збірала Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. У конкурсе, які ладзіла Міністэрства культуры, пераможцам стаў праект аўтарскага калектыву, у які ўвайшлі скульптары Вольга Нячай і Сяргей Аганаў, а таксама архітэктары Марыя Маркаўцова і Вольга Ярмоліна.

Паводле слоў архітэктараў, помнік зроблены так, каб не парушаць раней усталяванага кампазіцыю крыжоў. Але некаторыя крытыкуюць афіцыйны памятны знак.

"Некаторыя параўноўваюць знак з "прышчэпкай", іншыя знаходзяць яшчэ нейкія абразлівыя словы, – *адзначае актывіст Таварыства аховы помнікаў* **Юрый Меляшкевіч**. – Здаецца, усе крытыкі зацыклены на сваім асабістым супрацьстаянні з уладамі і чамусьці забываюцца пра тое, што гэты знак – важны чыннік прызнання ўладамі трагедыі, з якой сутыкнуўся наш народ. Гэты знак мы чакалі 30 гадоў (яго абяцалі паставіць яшчэ савецкія ўлады), шматтысячнымі мітынгамі патрабавалі прызнання злачынства. Прасілі, каб прызналі і пакаяліся. А цяпер улада ставіць гэты знак, і раптам аказваецца, што мы ўжо супраць.

Важна вярнуць народу памяць пра трагедыю мінулага, бо бяда можа паўтарыцца.

А што тычыцца "прышчэпкі", дык прыедзьце і паглядзіце на яе зблізу, пагаварыце з аўтарамі помніка пра яе сімвалізм, можа, вы зразумееце, што гэта прышчэпка ад савецкага таталітарызму, ад чалавекачэнавісніцкай ідэалогіі ў прынцыпе.



Курапаты – месца цішыні і памяці. У Курапатах побач са знічкамі ў руках могуць апынуцца ўсе, каму неабыякава, хто беражэ і захоўвае тое, што нас аб'ядноўвае".

***Алесь Чахольскі**, кіраўнік грамадскай дырэкцыі мемарыялу "Курапаты":*

– Справа нават не ў памятным знаку, а ў тым, каму яго перададуць на баланс і якая тэрыторыя наогул адыдзе пад мемарыял. Сёння чыноўнікі пачынаюць нейкія свае рэгламенты ўстанаўліваць у Курапатах, свае парадкі. Папярэджвалі нават, каб мы 28 кастрычніка на мітынгу на Дзяды не ставілі крыжы.

Днямі мы праводзілі міжнародную канферэнцыю, прысвечаную Курапатам, і якраз пра гэта гаварылі. Курапаты – помнік міжнароднай катэгорыі, і мы лічым, што яму патрэбна міжнародная падтрымка.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ



Александр ФЕДУТА

Свободу попугаям и бизнесменам!

Задержание и последовавшее за ним освобождение предпринимателя Аркадия Израилевича пробудили в обществе бурю эмоций. О его существовании до истории с Куропатами, в которой г-н Израилевич проявил себя, мягко выражаясь, не с лучшей стороны, никто из широкой публики не знал. А сегодня, после очевидного провоцирования скандала с защитниками народного мемориала, последовавшего затем интервью, в котором, на мой взгляд, прозвучала солидарность с теми, кто в Куропатах расстреливал безвинных людей, и уж совсем неприличная история с хамством человеку с ограниченными физическими возможностями, фамилия этого самого г-на Израилевича входит в топ запросов каждого уважаемого интернет-поисковика.

Мало того. Ситуация еще более обострилась, когда все, кому не лень, начали притягивать за уши факт национальной принадлежности, что уж и вовсе выглядело неприлично. Одни начали кричать чуть ли не о сионистском заговоре с целью уничтожения памяти о сталинских репрессиях и их жертвах; другие всуе поминали Холокост и предупреждали мировую общественность о росте антисемитских настроений.

В конце концов власти все это, думается, надоело, и г-на Израилевича арестовали. Судя по тому, что, продержав в СИЗО КДБ несколько суток, обвинения ему так и не предъявили, арестовывали его сугубо с воспитательными целями – ну, чтоб посидел в «американке» и подумал о том, насколько имеет смысл выходить из тени на свет и становиться публичной фигурой. «Воспитательный процесс», как я понимаю, завершился достаточно результативно: «воспитанник», выйдя на свободу, отказался давать интервью и комментарии, аргументируя это тем, что и так успел наговорить до задержания достаточно много. Дальше, как говорил принц Гамлет, – тишина…

Бизнес, ярким представителем которого пришлось стать г-ну Израилевичу, до сих пор не понимает основы деятельности любого сектора экономики. Вы можете купить десяток чиновников любого уровня и будете считать после этого, что держите, как говорится, бога за бороду. Вы можете пролоббировать любое выгодное вам решение во власти. Но наступит рано или поздно момент, когда этой самой власти придется выбирать между полученными от вас и давно потраченными деньгами и репутацией – будь то репутация в глазах международной общественности или собственных избирателей. И как вы думаете, что именно она выберет? Особенно накануне очередной избирательной кампании?

Обратите внимание, насколько странно выглядит сегодня ситуация вокруг пресловутого ресторана «Поедем поедим». Формально – служащие органов правопорядка, прикомандированные к объекту, следят за тем, чтобы никто там не нарушал закон. Неформально же это выглядит так, как если бы государственная структура выполняла функции частной охранной лавочки. Во всяком случае, если она открыто выступит на стороне гг. Израилевича, Зайдеса & Co, сомнений в этом почти не останется. Задержание же г-на Израилевича одним махом восстанавливает ее нейтральный статус. Мол, кто сказал, что мы поддерживаем этого самого г-на, успевшего, мягко говоря, набросать столько г-на на вентилятор, что без поллитры не разберешься? Неправда! Выйдет Израилевич – сами у него спросите.

Вышел. Спросили. Не ответил. Тоже – вполне прочитываемый и просчитываемый результат.

Если Израилевич обучаем, урок он усвоил, выводы сделал. Если не слишком обучаем – в следующий раз легким испугом не отделается. И тогда уже придется орать, как в том мультфильме: «Свободу попуга… – тьфу, бизнесменам!»

Но в данном случае ситуация оказалась сродни палке – о двух концах. С одной стороны, ударила она по г-ну Израилевичу. А с другой – по репутации и демократического сообщества, некоторые представители которого уподобились этому самому г-ну. Пока Аркадий Израилевич сидел в СИЗО КГБ (пресловутой «американке», где, как, вероятно, читатель знает, пришлось провести некоторое время и мне), отдельные посетители интернета начали хамить его жене. Ей-то – за что? Она чем провинилась перед защитниками Куропат, борцами с коррупцией, лоббистами интересов лиц с ограниченными возможностями и другими леди и джентльменами, которые почему-то уверены, что их позиция по тому или иному вопросу делает их абсолютно праведными и правыми по вопросам остальным?

Когда человек, защищающий самое правое дело, вдруг уподобляется идеологам сталинской эпохи, считая, что сын за отца, сестра за брата, а жена за мужа должны отвечать, да еще и не перед судом и не перед Богом, а лично перед ним, защитником этим самым, – простите, чем он лучше сталинского прокурора Вышинского или брежневского идеолога Суслова? И в каком положении оказываемся все мы, кто солидаризируется с ним по тому вопросу, в котором он прав? В роли антисемитов и мерзавцев, травящих женщину, которой и без того – в данный момент – пришлось нелегко? А ведь Маргарита Израилевич запросто могла бы распространить свое отношение к интернет-преследователям и на всех остальных. На тех, кто верит в Христа; кто говорит на белорусском языке; кто пытается восстановить справедливость по отношению к жертвам сталинских репрессий; на демократическую и национал-демократическую часть белорусского общества.

И самое печальное: такое отношение сформировалось бы не только у Маргариты Израилевич, но и у многих из тех, кто просто наблюдал за сложившейся ситуацией. Потому что в данном случае ответа на вопрос «За что?» быть просто не может. Ведь не за фамилию и не за национальность ее травили.

Как, впрочем, не за фамилию и не за национальность арестовали ее мужа.

Хотите знать, за что? Спросите у него. Он уже на свободе.

ГОРКІ ЛЁС



31 год у чарзе на кватэру…

Гісторыя жанчыны, якая 45 гадоў пражыла ў Гродне, з іх 36 працавала, 31 год стаяла ў чарзе на атрыманне кватэры, але і да сённяшняга дня жыве… у інтэрнаце.

«Праз год мы прыйшлі ў прафкам…»

У 1974 годзе **Міла Ракуць** 19-гадовай дзяўчынай прыехала працаваць у Гродна з Брэсцкай вобласці. Тры месяцы паскораных курсаў – і яна стала матальшчыцай на вядомым у той час на ўсю краіну буйным прадпрыемстве – тонкасуконным камбінаце. Разам з сяброўкамі Міла атрымала пакой у інтэрнаце на вуліцы Дамброўскага, 23. У аддзеле кадраў мілавідная жанчына паабяцала, што праз год яе паставяць у чаргу на кватэру. Жыццё тады толькі пачыналася і здавалася шчаслівым і бесклапотным.

«Праз год мы прыйшлі ў прафкам, каб запісацца ў чаргу на кватэру, а нам кажуць, што гэта можна будзе зрабіць толькі тады, калі нам споўніцца 24 гады, альбо ў выпадку змены сямейнага становішча, – згадвае Міла Вікенцьеўна. – *Канешне, нас гэта трохі засмуціла, але ненадоўга. У маладосці побытавыя рэчы не падаюцца сур'ёзнымі…»*

У 1980 годзе Міла нарадзіла дзіця і пяць наступных гадоў жыла з маленькай дачушкай у інтэрнацкім блоку, дзе акрамя іх месціліся яшчэ пяць дзяўчат. У 1985 годзе ёй як маці-адзіночцы выдзелілі асобны пакой у іншым інтэрнаце, але ў чаргу на атрыманне кватэры так і не паставілі. У прафкаме патлумачылі: інтэрнатам Мілу забяспечылі, а паколькі сям'я няпоўная, то ў чаргу паставіць не могуць.

«А ў тым інтэрнаце – агульная кухня, агульная прыбіральня, агульны душ, – распавядае Міла. – *Цяпер нават цяжка ўзгадваць, як мы там жылі...»*

Жанчыны з брыгады раілі ёй быць больш рашучай, бо інакш наогул застанецца без кватэры.

«І ў 1988 годзе ў прафкаме прынялі маю заяву аб пастаноўцы ў чаргу на атрыманне дзяржаўнай аднапакаёвай кватэры», – кажа спадарыня Міла.

«Не хадзі і не перашкаджай працаваць!»

Час ішоў, спадарыня Міла працавала на камбінаце, дачка расла, а з прафкама – цішыня. Часы былі неспакойныя, развалі ўся Савецкі Саюз. На яе шматлікія пытанні ў прафкаме без усякіх тлумачэнняў адказвалі: «Чакай, чарга падыдзе – дамо кватэру».

«Калі б тады хоць хто ў прафкаме падказаў ці прапанаваў мне ўзяць кааператыўную кватэру (там чарга ішла хутчэй), то я ў даўгі ўлезла б і была б з жыллём, – кажа спадарыня Ракуць. – *Але для мяне ў іх быў адзіны адказ: не хадзі і не перашкаджай працаваць, прыйдзе час – самі паклічам».*

Але жанчына стала заўважаць, што на прадпрыемстве кватэры атрымліваюць людзі, якія сталі ў чаргу пазней за яе. У той час панаваў хаос, і людзі імкнуліся атрымаць хаця б асобны блок у інтэрнаце, які перарабілі пад маласямейку.

«Я тады зразумела, што магу наогул застацца ні з чым, і пачала дамагацца, каб мне таксама выдзелілі блок у інтэрнаце для маласямейных. Праўда, папсавала шмат крыві, хадзіла са скаргамі ў аблвыканкам, і ў выніку мы з дачкой усё ж перасяліліся ў гэты блок. З выгодаў – прыбіральня і душ, а кухня на агульным калідоры», – канстатуе Міла Ракуць.

Была дзясятай, стала трыццатай

Пасля таго як у перыяд галоснасці людзі на прадпрыемстве пачалі больш рашуча адстойваць свае правы перад прафкамам, патрабаваць справаздачнасці, адміністрацыя прадпрыемства аб'явіла, што дзве чаргі – на дзяржаўнае жыллё і на кааператыўнае – аб'ядналі ў адну.

«І калі я ў сваёй чарзе была дзясятай, то ў новай стала ўжо трыццатай. Дабіцца нейкай яснасці не атрымлівалася, бо ніхто з намі не хацеў размаўляць», – успамінае жанчына.

Спадарыня Міла сцвярджае, што як маці-адзіночка ні разу не атрымала ад прафкама ні льготнай пуцёўкі ў дзіцячы лагер альбо санаторый для сваёй дачкі, ні матэрыяльнай дапамогі, хаця на той час яна ўжо больш за 20 гадоў працавала на прадпрыемстве.

А напрыканцы 1990-х у прафкаме заявілі, што дзяржаўных кватэр больш не будуюць.

У 2002 годзе спадарыня Ракуць і яшчэ некалькі работніц трапілі пад скарачэнне і былі звольнены. За некалькі год да пенсіі давялося шукаць новую работу, заробкі былі мізэрныя, хапала, каб толькі выжыць. І ў гэты час упершыню Міла атрымала паведамленне аб магчымасці пабудаваць асобную кватэру ў ЖСК.

«У банку прагледзелі мае дакументы і са спачуваннем патлумачылі, што не могуць выдаць крэдыт па той прычыне, што мне засталося працаваць адзін год да пенсіі, а гэта для іх занадта рызыкоўна. І мне давялося адмовіцца ад будаўніцтва...» – згадвае жанчына.

Хаджэнне па чыноўніках

У 2005 годзе чаргу на атрыманне жылля перавялі ў гарвыканкам. Адтуль у 2013 годзе Міла Ракуць атрымала запрашэнне ўвайсці ў жыллёва-будаўнічы кааператыў. Але паўтарылася тая ж гісторыя: банк адмовіў у крэдыце.

«Мая пенсія – 270 рублёў. Мне сказалі ў банку, што могуць выдаць крэдыт толькі ў 23 тысячы рублёў, але гэтага на будаўніцтва кватэры не хопіць. Прычым, каб атрымаць і такі крэдыт, мне прапанавалі прывесці паручыцеляў, заробак якіх складае не менш за 2 тысячы рублёў».

Шмат слёз тады выплакала жанчына, але паспагадаць ёй не было каму – побач ні родных, ні блізкіх. Пайшла ў кватэрны аддзел гарвыканкама, распавяла сваю гісторыю.

«А чыноўнік здзіўлена лыпаў вачыма і не мог зразумець, чаго я хачу. Казаў: на сацыяльнае жыллё вы прэтэндаваць не можаце, бо жывяце ў інтэрнаце; пабудавацца ў ЖСК таксама немагчыма, бо ў вас няма грошай; арэнднае жыллё для вас задарагое. Дык што, маўляў, вы тады хочаце? Казаў: «У вашым становішчы толькі і жыць у інтэрнаце», – з горыччу згадвае тую размову спадарыня Міла. – *Я нічога не магла яму адказаць, проста сабралася і пайшла».*

Пасля гэтага яна запісалася на прыём да старшыні аблвыканкама. Згадвае, што **Уладзімір Краўцоў** вельмі ўважліва яе выслухаў.

«Я бачыла, што ён мяне разумее, і сказала яму ўсё наўпрост – што прыехала сюды ў 19, што пражыла ў Гродне 45 гадоў, з іх 36 адпрацавала, плаціла падаткі і ў выніку не заслужыла кватэры. Так што ж атрымліваецца – я жыццё пражыла ўпустую?.. – задае Міла Вікенцьеўна рытарычнае пытанне. – *Я сказала, што не маю да кіраўніка аблвыканкама асабіста ніякіх прэтэнзій, але прыйшла да ўлад запытацца, што мне рабіць».*

На абласным узроўні спадарыні Ракуць хіба што толькі паспачувалі, але як жыць на пенсію ў 270 рублёў, ніхто так і не сказаў. Яна распавядае, што за камунальныя паслугі даводзіцца плаціць звыш ста рублёў. Праўда, у яе прапісаны дачка і ўнук, якія працуюць зараз у Расіі. Будынак інтэрната не рамантаваўся столькі, колькі яна тут жыве, сантэхніка старая, трубы іржавыя, кухня агульная...

«Але самае цяжкае, што людзі цяпер сталі злыя, лаюцца на кухні. І ўсё гэта ад безграшоўя, усе змучаныя такім жыццём, бо ніякага прасвету не відаць. Сістэма папросту скалечыла людзей, і яны становяцца як звяры, адзін аднаго праклінаюць», – са скрухай заўважае спадарыня Міла.

Міхал КАРНЕВІЧ.

На здымку: Міла Вікенцьеўна Ракуць.

ПАМЯЦЬ

Канстанцін Астрожскі ў бронзе



У Вільнюсе на мурах старажытнага храма Святой Тройцы, які належыць Украінскай уніяцкай царкве, днямі была адкрыта мемарыяльная дошка выдатнаму дзяржаўнаму дзеячу ВКЛ, палкаводцу, які перамог больш як у 60 бітвах, Канстанціну Астрожскаму. На дошцы пад барэльефам змешчаны надпіс на літоўскай і ўкраінскай мовах: "Фундатар гэтай святыні, збудаванай на знак удзячнасці Госпаду за перамогу над маскавітамі ў бітве 1514 года пад Оршай, – вялікі гетман літоўскі Канстанцін Астрожскі (1460–1530)". Памёр гетман у беларускім Тураве, а пахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры; яго постаць – адна з самых шанаваных ва Украіне.

Антон ЗАГОРСКІ.

ПОСЛЕ ОТСТАВКИ

Кобяков трудоустроился

Бывший премьер-министр Беларуси Андрей Кобяков стал независимым директором ОАО «Белгазпромбанк», сообщила пресс-служба финансового учреждения. Как известно, он был отправлен в отставку 18 августа.

По информации банка, в начале октября текущего года Кобяков прошел оценку специальной комиссии Национального банка на соответствие квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации.

РЭГІЁН

Вярнулі мільён рублёў…

Органамі пракуратуры Брэсцкай вобласці ўстаноўлена, што некаторыя прадпрыемствы вобласці і мясцовыя органы не прадпрымалі адэкватных мер, каб палепшыць сітуацыю з даўгамі, якія ўтварыліся. У спіс трапілі ААТ «Будаўнічы трэст №25», Маларыцкі кансервава-гароднінасушыльны камбінат, Белаазёрскі энергамеханічны завод, птушкафабрыка «Дружба» і іншыя.

Пракуратура Брэсцкай вобласці нават распачала крымінальную справу па артыкуле "Службовая халатнасць" у дачыненні да кіраўніка адной з сельскагаспадарчых арганізацый рэгіёна. З-за неналежнай прапрацоўкі пытання выбару пастаўшчыка і папярэдняй аплаты прадукцыі, якую расійскі контрагент фактычна не паставіў, беларускаму прадпрыемству нанесены ўрон у суме 43 тысячы рублёў.

Усяго за дзевяць месяцаў гэтага года органы пракуратуры Брэсцкай вобласці прад'явілі ў Эканамічны суд тры іскі на суму 3,78 мільёна рублёў. Як гаворыцца ў афіцыйным паведамленні, «*прынятыя пракурорамі меры спрыялі рэальнаму вяртанню прадпрыемствам вобласці 1 мільёна рублёў валютнай выручкі*».

ПИСЬМА ИЗ ДЕРЕВНИ

Чужой на твоей кухне

Из белорусских деревень в государственные инстанции уходят письма. Их много, и они, как правило, о проблемах житейских. Поскольку политикой здесь особенно не увлекаются и вечные двигатели не изобретают.

Сегодня мы обратимся к проблемам одного из отправителей писем в инстанции – фермера **Зенона Маркевича** из Миорского района Витебской области.

Читаем (стиль и орфография сохранены. – **Ред.**): *«Обращаюсь к Вам с просьбой рассмотреть вопрос о незаконном изъятии земель из моего хозяйства и передаче иным лицам, а также незаконной передаче сельскохозяйственных земель под застройку в частную собственность.*

Согласно решениям №153 от 31 августа 1991 года и №811 от 27 декабря 2001 года Миорского райисполкома, земли колхоза «Рассвет» урочища Наволока площадью 26,6 га и 2,1 га были переданы в полном объеме в пожизненное наследуемое владение главе К(Ф)Х Маркевичу З.А.

Согласно экспликации земельного участка, а также пояснительной записке за подписью Н.Клинцевич видно, что начальником землеслужбы Миорского райисполкома Якутовым В.И. совершено сокрытие земельного участка площадью 1,04 га и фальсификация решения Миорского райисполкома путем отвода леса 1,12 га, дороги 0,48 га. Я предполагаю, что эти земли были украдены из моего КФХ для реализации под застройку путем сговора начальника землеслужбы с руководством Новопогостского сельского совета. На мой запрос о предоставлении земдела колхоза «Рассвет» с передачей земель для моего КФХ я получил ответ из Миорского райисполкома, что его нет в архиве. Причины отсутствия не известны».

(Из письма руководителя фермерского хозяйства КФХ Зенона Альземовича Маркевича в Администрацию президента Республики Беларусь.)

Простая история

Вообще говоря, история простая, как бутерброд. Фермер Зенон Маркевич в 1991 году получил в урочище Наволока под Миорами участки земли «*площадью 26,6 га и 2,1 га*», которые «*были переданы в полном объеме в пожизненное наследуемое владение*». Как пишет фермер в этом же обращении, 27 лет он использовал эти земли – засевал их травами, пас скот, заготавливал сено. Но, к несчастью, места эти удивительно красивы. К тому же рядом озеро. А красота, как известно, страшно притягательная сила!

То есть места эти понравились вначале одному из местных начальников, а потом предпринимателю из Минска. В результате сельхозугодья фермерского хозяйства, необходимые для выращивания скота, передаются частным лицам под застройку. То есть на землях КФХ появился еще один хозяин. Это как незваный хозяин на вашем огороде! Или незваная, но уверенная в себе хозяйка на вашей с женой кухне…

Естественно, фермер Маркевич возмутился и начал доказывать свою правоту.

Эпистолярная трагедия

Содержание писем Зенона Маркевича в разные инстанции – Администрацию президента РБ, инстанции Витебского облисполкома, разного рода контролирующие органы – примерно одинаково. Основные положения уже процитированы выше – он просит всего лишь восстановить справедливость, чтобы спокойно работать на своем участке земли. Что с успехом и делал предыдущие 27 лет.

А трагедия эпистолярного жанра в том, что ответы из инстанций, как правило, стандартны и, я сказал бы, одинаково равнодушны. Например, Госкомимущество «*направляет данное обращение в Витебский облисполком для рассмотрения в соответствии с компетенцией и ответа заявителю*». И сообщает, что «*дача правовой оценки действиям местных и распорядительных органов к компетенции Госкомимущества не относится*».

Землеустроительная служба Витебского областного исполнительного комитета: «*Рассмотрев предоставленные вами выкопировки, изготовленные из разномасштабного картографического материала, и в разные временные промежутки… невозможно определить, существует ли накладка границ КФХ «Маркевич» и населенного пункта Наволока Новопогостского сельсовета*».

Определить невозможно! …Прочитав такое заключение, думай что хочешь и делай какие хочешь выводы! Витебский областной исполнительный комитет сообщает: «*законных оснований для удовлетворения ваших требований не имеется.*

Настоящий ответ на обращение Вы вправе обжаловать в суд в порядке, установленном законодательством».

На запрос фермера Маркевича в Миорский райисполком о предоставлении земельного дела, чтобы основательно во всем разобраться, последовал ответ: «*его нет в архиве*».

Вот так: документов нет в архиве. А где они? Сгорели? Уничтожены? А ведь они очень нужны в преддверии приближающегося очередного суда – на сей раз по иску земельных служб, которые обвиняют неугомонного фермера Маркевича в несоблюдении некоторых правил с последующим штрафом. И проблема не в штрафе, а в том, что по закону, если фермер подвергается штрафным санкциям, то можно изъять у него землю и передать кому-то другому, возможно, более сговорчивому.

Только факты

Автору сложно давать оценку деятельности госорганов в ходе этого дела, нешумного, но болезненного для фермера, честного производителя хорошего отечественного молока и мяса. Более того: автор признает свою некомпетентность в хитросплетении правовых норм и подзаконных актов, на которые ссылаются чиновники в своих ответах.

То есть в соответствии со стандартами профессиональной этики журналист ориентируется только на факты. Если выяснится, что фермер в чем-то неправ, мы непременно сообщим об этом читателям. Если выяснится, что прав, – сообщим тем более!

Главное, что пока можно сказать уверенно, мы будем следить за развитием событий.

Анатолий ГУЛЯЕВ.

Миорский район.

НЕСТАНДАРТНАЯ СИТУАЦИЯ

Амбиции и политика

Джазовый вундеркинд

Девятилетняя София Курлович из Солигорска успела прославиться как джазовая пианистка не только в Беларуси, но и за ее пределами. Повелительница черно-белых клавиш, самая обаятельная исполнительница, джазовый вундеркинд – это лишь часть эпитетов, какими награждали ее СМИ во время различных фестивалей и конкурсов. И было за что.

Первую большую известность у массового зрителя Беларуси и России талантливая девочка получила в семь лет, участвуя в программе Максима Галкина «Лучше всех». Тогда она выступала сольно и в дуэте с Игорем Бутманом, известным саксофонистом.

На сегодняшний день в ее «послужном списке» множество достижений и побед. И это при ее юном-юном возрасте. Вот неполный перечень их. Первое место в телепроекте "Талент краіны" в 2016 году, Гран-при Международного фестиваля эстрадно-джазовой музыки «Jazz-moment» – Москва, декабрь 2016 года, участие в концерте «Симфоджаз» братьев Ивановых, который проходил в Москве в Концертном зале имени П.И.Чайковского в марте 2017 года. Она также участвовала в фестивале «Пасхальные концерты Д.Мацуева» в апреле 2017 года, в фестивале «Детский триумф джаза» в Москве в марте 2017 года, в фестивале-конкурсе Эмира Кустурицы «Большой» в Сербии в 2017 году. София Курлович – финалистка Всероссийского конкурса «Синяя птица» – декабрь 2017 года. Нынче ей вручили Гран-при 7-го Международного конкурса джазовой и эстрадной музыки «Jazz-time 2018».

Солигорская детская школа искусств, естественно, гордилась своей воспитанницей. Можно сказать, что имя этой девочки стало для школы визитной карточкой. Педагог Софии Светлана Владимировна Петрович, которая занималась с ней джазовым направлением, была очень довольна своей ученицей и ее успехами.

Переориентировка

И вот на этом, казалось бы, прекрасном взлете мама Софии Ольга Николаевна заявила, что она хочет перевести дочь к другому педагогу, и не вообще к другому, а конкретно к Елене Георгиевне Бельской, которая не учит играть джаз, а специализируется на классическом репертуаре. Как, собственно, и требует обычная программа базового музыкального образования.

Из письма Ольги Курлович в «Народную Волю»:

*«Пианист Денис Мацуев (*народный артист Российской Федерации, лауреат Государственной премии РФ. – **Авт.***), Юрий Розум (*народный артист России, солист Московской государственной филармонии. – **Авт.***), другие профессиональные музыканты... настойчиво и неоднократно рекомендовали нам (если мы собираемся связать наше будущее с музыкой) оставить концертную деятельность и как можно скорее заняться приобретением базовых знаний, которые основываются на классическом репертуаре. Мы пробовали ездить в Минск к педагогу, но физически это оказалось очень трудно, так как дочь еще маленькая. В Минске нам рекомендовали педагога из нашего города Елену Георгиевну Бельскую, многие ученики которой были успешно подготовлены к поступлению в специальные учебные заведения. Мы были счастливы, когда узнали, что она в настоящее время работает в нашей же школе искусств».*

То есть получается, что, несмотря на фурор, который производила своими выступлениями на концертах маленькая солигорская джазовая пианистка, и ее яркое дарование, именитые российские пианисты прямо указали, что без приобретения базовых музыкальных знаний и умений, которые дает исполнение классического репертуара, с успешным музыкальным будущим у Софии могут быть проблемы.

Почему какое-то время возили девочку в Минск к педагогу по классике, а не обучались классическому репертуару в Солигорской детской школе искусств? Этот минский педагог, как я слышала, профессионал высокого уровня. Но София еще продолжала занятия джазом у Светланы Владимировны Петрович, и разрываться между двумя городами в плане обучения – это дополнительная нагрузка на детский организм, дополнительные затраты для родителей.

На это недоумение мама Софии ответила, не вдаваясь в подробности:

– В течение полутора месяцев дочь действительно занималась в школе у педагога по общему базовому музыкальному образованию, но потом мы решили прекратить занятия. Через какое-то время нам в Минске порекомендовали Елену Георгиевну Бельскую.

Ольга добавила, что в июне этого года сообщила педагогу Софии Светлане Владимировне Петрович что будет переводить дочку к Елене Георгиевне Бельской, обучение джазу они пока прерывают, как и связанную с ним концертную деятельность. По словам Ольги Курлович, ей показалось, что ее поняли и услышали.

«Учитель работает последний год...»

Но 30 августа Ольгу пригласили на беседу к директору Солигорской детской школы искусств Олегу Александровичу Щербову. В его кабинете, когда она пришла, находилась также С.В.Петрович.

– Мне предложили два варианта, – вспоминает Ольга Курлович. *– Первый – дочь продолжает заниматься джазовым направлением у Светланы Владимировны Петрович, второй – переходить для получения базового музыкального образования к Марине Сергеевне Жданович (завучу школы). Я отказалась. При этом мне сказали, что Бельская работает последний год, поэтому, мол, нет никаких шансов выучиться у нее.*

Несмотря на эти перипетии, София начала заниматься у Е.Г.Бельской. Но по распоряжению директора школы ей были уменьшены учебные часы. То есть минимум, прописанный по плану базового музыкального образования, ей оставили, а вот те часы, что обычно добавляются дополнительно учащимся, которые подают надежды, сняли.

Не согласившись с таким подходом, Ольга Курлович обратилась в райисполком, после чего проблема была решена.

Но 21 сентября она получила письмо от администрации школы. В нем напоминание, что Бельская работает последний учебный год.

Что выше – рейтинг школы или будущее ребенка?

Как учителя фортепианной музыки Елену Георгиевну Бельскую хорошо знают не только в Солигорске, но и далеко за его пределами. Педагог и концертмейстер высшей категории. Закончила консерваторию. Базовое музыкальное образование получили 55 ее учеников, 23 из которых продолжили потом музыкальное образование в средних специальных и высших учебных заведениях. Среди ее учеников немало тех, кто добивался побед на областных и республиканских конкурсах фортепианной музыки. Есть те, кто завоевывал награды на конкурсах международного уровня.



София Курлович и российский пианист-виртуоз Денис Мацуев.

До того как перейти на работу в Солигорскую детскую школу искусств, а случилось это в 2014 году, Елена Георгиевна более 36 лет проработала в здешней детской музыкальной школе. Фортепианный класс Бельской был известен в городе своими ежегодными апрельскими концертами классической музыки, которые проходили на протяжении трех десятков лет и на которые приезжали выступать также ее бывшие ученики. Елену Георгиевну за ее труд и мастерство педагога неоднократно награждали (только с 2000 года – 19 раз). Одних грамот Министерства культуры Республики Беларусь у нее шесть. В октябре 2005 года Е.Г.Бельской вручили государственный знак «За вклад в развитие культуры Беларуси».

Возраст у Е.Г.Бельской действительно пенсионный. И уже не первый год. Но она хорошо выглядит, яркая, энергичная, и у нее достаточно сил и желания заниматься своим профессиональным делом.

– В начале сентября директор меня предупредил, что я работаю в школе последний год. Думаю, что как к преподавателю у него ко мне претензий нет, а основная причина, почему решили не продлевать со мной контракт – это то, что мама Софии захотела, чтобы я учила ее дочь, – считает Елена Георгиевна. *– Я понимаю: у руководства школы были определенные планы на талантливую, яркую девочку. Про то, что были эти планы, не мои предположения – это было высказано открытым текстом руководством школы и мне, и родителям Софии. Полагаю, рассчитывали, что ребенок и дальше будет успешно выступать, побеждать, в том числе и за границей, и приносить школе и своему учителю по джазу известность, поднимать их рейтинг. Сами по себе такие ожидания, может, и вполне естественны, но они должны быть отброшены, если создают помеху в получении тех базовых умений и знаний, которые в дальнейшем позволят одаренному ученику стать серьезным профессионалом на музыкальном поприще.*

Елена Георгиевна добавила, что школа – это прежде всего место, где ребенка обучают, думают о его интересах. Амбиции директора и педагогов на первый план выходить не должны.

– Софию Курлович не включили в число участников юбилейного концерта школы, который состоится в конце ноября. На заседании отделения фортепиано прозвучала прямая речь завуча М.С.Жданович: София Курлович ни при каких условиях не будет участвовать в этом концерте.

На вопрос, отразилась ли, на ее взгляд, сложившаяся ситуация на ребенке, педагог ответила, что девочка уже полностью с ней в контакте. София обладает чувством юмора, и заметно, что характер у нее есть. Иногда, правда, ее взгляд становится грустным.

«Нам нужно омолаживать кадры...»

Светлана Владимировна Петрович – педагог высшей категории. В 2017 году за успехи в педагогической деятельности стала лауреатом конкурса «Творческий олимп Минщины», занесена на Доску почета Солигорского района. Имеет благодарность от Министерства культуры Республики Беларусь.

На момент нашей беседы Светлана Владимировна уже несколько недель исполняла обязанности директора Солигорской детской школы искусств.

С.В.Петрович рассказала: директор Олег Александрович Щербов устно уведомил Бельскую еще в конце мая, что она работает в школе только до 31 августа 2019 года. На ее место придет молодой специалист. В государстве поддерживается политика омоложения кадров, для выпускников высших и средних специальных учебных заведений нужны вакансии.

В 2018 году из школы были уволены два преподавателя-пенсионера. Елена Георгиевна последняя, кто работает в школе искусств после выхода на пенсию. Текучки кадров в школе нет, а есть резерв.

– Когда мы узнали, что мама Софии хочет перевести свою дочь именно к Елене Георгиевне, директор при встрече сказал Ольге Курлович, что Бельская преподает в школе последний год. Я присутствовала при этом. Мама Софии ответила, что ее устраивает такой вариант, так как через год девочка все равно будет поступать в музыкальный колледж при Белорусской государственной академии музыки, – продолжила моя собеседница. Она подчеркнула: школа никогда не была против того, чтобы София Курлович обучалась по классическому направлению. Главное здесь – выбор родителей.

Светлана Владимировна пояснила, что фортепианное отделение Солигорской детской школы искусств работает в двух направлениях – классическом и эстрадно-джазовом. Эстрадно-джазовое действительно в приоритете. Школа многого добилась в этом направлении, но и обучение классической музыке ведется на достаточно высоком уровне. Солигорская детская школа искусств, по ее словам, уникальна. На базе школы проводятся различные международные фестивали и конкурсы. Особенно известным и популярным стал Международный джазовый конкурс «Jazz time».

По словам Светланы Владимировны, узнав, что мама девочки хочет, чтобы ее дочь училась классике, она предложила заниматься в этом направлении у педагога Марины Сергеевны Жданович. Педагога, как она уверяла, опытного, среди учеников которого – лауреаты областных, республиканских и международных конкурсов. Но гастрольный график Софии сыграл здесь отрицательную роль. Она часто просто не могла прийти на урок. Да и сил, очевидно, на два направления одновременно не хватало у ребенка.

– Когда ее мама сказала, что дочка все же оставит джаз и займется классической музыкой, никто не был против. Но мы опять порекомендовали отдать Софию в класс Марины Сергеевны Жданович. Ольга Николаевна не согласилась. Она имеет право на выбор учителя, конечно. Но еще раз повторяю: контракт с Бельской на следующий год мы подписать не можем.

– Нам нужно омолаживать кадры, это политика государства, поэтому Елене Георгиевне, как ни печально, придется уйти. А ее часы по концертмейстерству (это работа по совместительству с основной занятостью) мы отдали молодым учительницам, которые вышли из декрета, – сказала напоследок исполняющая обязанности директора.

Востребованы – почему не дать поработать?

А вот мнение некоторых родителей нынешних учеников Елены Георгиевны Бельской:

Марьян Янович Комар:

– Мой сын Андриан занимается у Елены Георгиевны четвертый год. Она достойный учитель, профессионал высокого уровня. Она требовательна, лениться у нее невозможно – вижу по собственному ребенку.

Виктория Александровна Пермякова:

– Мой сын Илья занимается в школе искусств четвертый год, а у Елены Георгиевны – первый. За непродолжительное время уже видны подвижки в лучшую сторону. Сыну нравится, что стал разучивать серьезные вещи, усилилось его стремление стать музыкантом. Я рада, что Илья учится у Бельской. Она ответственная, требовательная, при этом видно, что у нее есть подход к детям.

Наталья Владиславовна Песоцкая:

– Я часто бываю на уроках у Елены Георгиевны, когда она занимается с моей дочерью. И думаю: если бы Бог в свое время дал мне такого педагога, может, профессия моя была бы связана с музыкой. Я закончила музыкальную школу в Слуцке.

Евгений Чистяков, бывший ученик Елены Георгиевны, в 1992 году стал лауреатом Республиканского конкурса пианистов (вторая премия):

– Елена Георгиевна – учитель от Бога. У нее играли все. Каждый ученик для нее был лучшим. До сих пор с благодарностью ее вспоминаю.

Был телефонный разговор с **Юрием Николаевичем Гильдюком** – художественным руководителем Белорусской филармонии, пианистом, заслуженным артистом Беларуси.

Он сказал, что знает Елену Георгиевну давно и считает ее серьезным, опытным педагогом. Специалистом штучным, которого необходимо ценить. Для Солигорска должно быть важным иметь учителя фортепиано такого уровня.

В конце своего письма в «Народную Волю» Ольга Николаевна Курлович написала: «В классе у Е.Г.Бельской девять учеников, и все они настроены так же, как и мы, – все хотят заниматься у этого педагога».

Многие читатели наверняка скажут: а в чем, собственно, проблема? Почему "таленту краіны", явно перспективной и одаренной девятилетней Софии Курлович, а также другим ученикам Е.Г.Бельской не продолжить учиться у нее и в следующем году, и еще через год? Ах, да, она пенсионерка, и программа соответствующая у нас на этот счет есть. Так, может, имеет смысл скорректировать эту программу для спецов и профи, подобных Бельской? Во всех сферах деятельности. Есть у таких людей желание и силы работать – так пусть работают и сами решают, когда им на покой. От этого ведь польза была бы не только конкретным людям, но и обществу в целом.

Лариса НАСАНОВИЧ.
Солигорск.

БОЛЬ

«На жаль, добрых навін пакуль няма...»

"Народная Воля" пацікавілася, як здароўе вядомага кампазітара Ігара Лучанка, які з 2 лістапада з інсультам знаходзіцца ў рэанімацыі Бальніцы хуткай дапамогі.

"Пакуль усё па-ранейшаму, добрых навін, на жаль, няма, – распавяла "Народнай Волі" жонка **Ігара Лучанка** Аляксандра Рыгораўна. *– Ён па-ранейшаму падключаны да апаратаў. Дактары не робяць ніякіх прагнозаў".*

Аляксандра Лучанок разам з дзецьмі кожны дзень ездзіць у Бальніцу хуткай дапамогі.

"Дзякуй усім, хто турбуецца за Ігара Міхайлавіча", – гаворыць Аляксандра Рыгораўна.

Інсульт у Ігара Лучанка здарыўся пад раніцу – жонка прачнулася, знайшла яго без прытомнасці і адразу выклікала "хуткую".

"Сітуацыя сур'ёзная, аперацыя дала пэўны эфект, нам зараз застаецца толькі чакаць. І верыць, што ў бацькі знойдуцца сілы на адняўленне", – кажа сын Ігара Лучанка Андрэй.

Дай Бог, каб так яно і атрымалася. "Народная Воля" жадае маэстру таго ж, што і яго сям'я.

Нагадаем, што ў жніўні гэтага года Ігар Лучанок адсвяткаваў 80-годдзе.

Марына КОКТЫШ.

ФІНАНСЫ

Крэдыт на выплату крэдыту

Дамоўленасць аб выдзяленні расійскага дзяржкрэдыту ў 2019 годзе дасягнута, наступная стадыя – заключэнне адпаведнага пагаднення, паведаміў учора журналістам міністр фінансаў Беларусі **Максім Ермаловіч**.

Як паведамлялася раней, урад Беларусі звярнуўся да ўрада Расіі з просьбай прадаставіць у 2019 годзе дзяржкрэдыт на 1 млрд долараў для рэфінансавання часткі знешняга доўгу, выплаты па якім у наступным годзе складуць 3,6 млрд долараў.

СУД

Ігар КОМЛІК: «Абмежаванняў пакуль няма»

Лідары прафсаюза РЭП распавялі, што будуць шукаць праўду ў вышэйшых судовых інстанцыях.

Як ужо вядома, 9 лістапада ў Мінскім гарадскім судзе адбыўся разгляд апеляцыйных скаргаў кіраўнікоў незалежнага прафсаюза РЭП Генадзя Фядыніча і Ігара Комліка.

24 жніўня яны былі прызнаны вінаватымі па ч.2 арт.243 Крымінальнага кодэкса (ухіленне ад выплаты падаткаў у буйным памеры). Суд Савецкага раёна асудзіў іх на 4 гады абмежавання волі без накіравання ва ўстановы адкрытага тыпу з забаронай займаць кіруючыя пасады тэрмінам на 5 год. У скарзе Фядыніч і Комлік прасілі спыніць крымінальную справу, але суд пакінуў прыгавор у сіле.

"Пакуль ніякіх абмежаванняў для нас няма, – кажа **Ігар Комлік**. *– Рашэнне Мінскага гарадскога суда, напэўна, павінна яшчэ паступіць у Дэпартамент выканання пакаранняў МУС і ўжо затым, відаць, будуць знаёміць нас з правіламі адбыцця пакарання. У той жа час мы працягнем абскарджваць рашэнні папярэдніх судовых інстанцый. Спачатку ў Вярхоўным судзе, а калі нічога не зменіцца, то пройдзем і ўсе міжнародныя інстанцыі".*

Генадзь Фядыніч пакуль яшчэ з'яўляецца старшынёй прафсаюза РЭП і таксама адзначае, што на гэтым справа не закончыцца.

"Прынята рашэнне рыхтаваць скаргу ў Міжнародную арганізацыю працы, таму што сёння парушаюцца не толькі правы нашай арганізацыі, але і іншых незалежных прафсаюзаў, – кажа ён. *– Мы будзем ізноў выходзіць на Глабальны прафсаюз "Індустрыял", на Еўрапейскі парламент і іншыя міжнародныя арганізацыі".*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СІТУАЦЫЯ

21 снежня ў Германіі вырашыцца лёс Юрыя Рубцова

Нагадаем, што Рубцоў стаў вядомы як "чалавек-майка". На вулічныя акцыі апазіцыі ў Мінску ён выходзіў у майцы з палітычнымі надпісамі. Самым вядомым стаў лозунг "Лукашэнка, сыходзь!". У кастрычніку 2014 года Рубцова асудзілі на два з паловай гады абмежавання волі, абвінаваціўшы ў абразе суддзі. На "хіміі" Рубцоў адмаўляўся працаваць, патрабуючы годны заробак, і трымаў галадоўку. Ён зрабіў сабе на грудзях тату "Лукашэнка, сыходзь".

28 мая 2015 года суд прыгаварыў Рубцова да двух гадоў калоніі агульнага рэжыму. Але 22 жніўня яго ў ліку іншых палітвязняў памілаваў сваім указам Аляксандр Лукашэнка. Пасля гэтага Юрый Рубцоў папрасіў палітычны прытулак у Германіі, рашэння давялося чакаць каля года. Яно аказалася не на карысць гамяльчаніна, але той вырашыў падаць апеляцыю на адмову. У Германіі Рубцоў знаходзіцца ўжо каля трох гадоў, але зараз нямецкія ўлады могуць адправіць яго дадому.

"Пакуль што працую памочнікам хатняга майстра, – распавядае ён. *– Займаюся рамонтам дзвярэй, замкоў, вокнаў і гэтак далей. Праца – чатыры гадзіны ў дзень, часам і больш. Улічваючы мой статус, мне могуць плаціць толькі 80 цэнтаў за гадзіну, але галоўнае тут не грошы. Чакаю рашэння суда, які прызначаны на 21 снежня. Калі не пакінуць у Германіі, значыць, такі мой лёс. А на лёс скардзіцца не варта".*

Віктар ШПАК.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Кара просіцца адна: дастаткова бізуна

У Рагачове заведзена крымінальная справа (хуліганства) на трох школьнікаў, якія, выпіўшы піва, зламалі ў пасаджаным скверы сем арабін. І хоць узамен яны потым пасадзілі 11 дрэўцаў, справу не закрылі, ім пагражае папраўчая калонія.

Калі нашмат пражыў на свеце,
Калі па-сутнасці смаркач,
У галаве гуляе вецер,
І думкі тлумныя – наўскач.
Таму не дзіва, што падлеткі,
Зусім адбіўшыся ад рук,
Зрабілі прыкры выбрык гэткі –
Зламалі дрэўцаў колькі штук.
Чаму, спытаеце, не дзіва?
Чым растлумачыць іх намер?
Бо хлапчукі глынулі піва,
Перш чым падаццa ў блізкі сквер.
Яны ўспрымалі як забаву
Учынак «дробязны» такі…
Ды раптам узбудзілі справу
За хуліганства следакі.
Было б, канешне, справядліва,
Каб пакараў закон бацькоў,
Калі іх дзеці жлукцяць піва
І ў скверы «наламалі дроў».
Бацькі – і толькі! – вінаваты.
Але магчыма, што дзяцей
Адправіць заўтра суд за краты,
Бо так зрабіць куды прасцей.
На шчасце прападуць спадзевы,
І пойдзе ўсё наперакос…
Яны, хлапцы, зламалі дрэвы,
А мы зламаць ім можам лёс.
* * *
Я думку слушную падкіну
(І неаспрэчная яна):
Не варта прымяняць дубіну,
Калі хапіла б бізуна.

Малаток будаўніку зайздрасць сунула ў руку

Будаўнік з Гродна, даведаўшыся, што калега атрымлівае большую зарплату, чым ён, збіў таго малатком.

Папрацавалі добра вельмі!
Прараб паклікаў на абед.
Калі пад'елі, «майстар кельмы»
Адкрыў калегу свой сакрэт:
– Мы маем розныя зарплаты
З табой з надаўняе пары:
Ты носіш тысячу дахаты,
А я прыношу паўтары,
Хоць не хадзіў у кабінеты,
Не абіваў парогаў, каб
Мне выдавалі бонус гэты –
Відаць, паруніўся прараб…
Калегу «задушыла жаба»,
І навать абуяла злосць,
Прычым зусім не на прараба,
Які другому «кінуў косць»,
А на таго, хто вочы муляў,
Хто мае грошай значна больш.
І што ж зрабіў калега-муляр,
Каб заглушыць душэўны боль?
Не распачаў ён свару-зваду,
А ўзяў у рукі малаток,
Падкраўся да калегі ззаду,
Яму па кумпалу натоўк,
Каб гнеўнай помстай наталіцца.
І зараз выбару няма:
Прытулак першаму – бальніца,
Другому «лежбішча» – турма.
– Хіба ж няшчасны вінаваты?
Ці ж браца нам за малаткі,
Калі ў нас розныя зарплаты? –
Дзівіліся будаўнікі. –
Калі паплечніку заробкі
«Наверсе» паднялі цішком,
Няхай бы ён «паправіў клёпкі»
Прарабу гэтым малатком…
***
Даводзіць зайздрасць
да шаленства,
Душу знявечвае, на жаль…
Згадаў я выпадак з маленства –
Хай ён паслужыць як мараль.
Падслухаў я адну бяседу.
Пажаліўся дзяцюк Пятро
Нічыпару, свайму суседу,
Як быццам выпілі вядро:
– За што, скажы, такое гора
Паслаў мне, небараку, бог?
Ці верыш, раніцай учора
Кабанчык трохпудовы здох…
Баюся, каб не здохлі, дружа,
Мае другія кабаны…
Нічыпар быў паддаты дужа,
А п'яны, кажуць, што дурны.
Няма ў Нічыпара спагады,
Іскрынкі хціўвя ўвачу:
– Кабанчык здох?
Ну так я рады!
Ад шчасця аж скакаць хачу!
Калі ж яшчэ й карова здохне,
І цёлка спраўная твая,
Лічыцьму, што спрые бог мне,
І буду радасны ўтрая…

SOS!

Помогите!

Здравствуйте, редакция газеты «Народная Воля»!

Пишет вам Владимир Владимирович Величкович по поручению своей матери, инвалида 1-й группы, вдовы участника ВОВ, проживающей в деревне Нарушово Глубокского района. А суть письма в следующем.

В мае этого года умер мой отец, инвалид 1-й группы. Он много лет находился на обслуживании по уходу в органах соцобеспечения. За ним ухаживал человек, который получал за это госпособие. В то время моя мать была инвалидом 2-й группы.

После смерти отца мама написала заявление с просьбой, чтобы за ней также закрепили соцработницу. Временно она ей помогала, потом сказали, что поскольку она стала получать пенсию, то по закону не может быть оформлена и по уходу за мамой. При этом пообещали найти другого человека, который выполнял бы такие же обязанности. Но прошло пять месяцев, а вопрос не решился. Матери предложили переехать в больницу сестринского ухода, но это для нее неприемлемо в финансовом отношении. Нахождение в этом учреждении платное. Из пенсии удерживают сумму в размере 80 процентов. А пенсия у нее 317 рублей. Следовательно, ей остается 63 рубля, а только на лекарства каждый месяц необходимо тратить 80–100 рублей, так как не все необходимые ей препараты выписываются по льготным рецептам. Кроме того, она инсулинозависимая. Колется инсулином в 9 часов утра и в 9 часов вечера, после чего обязательно нужно принять пищу, иначе может наступить кома. В больнице сестринского ухода последний раз кормят в седьмом часу. Следовательно, деньги нужны и на дополнительное питание, но их на это у нее вообще не будет. Поэтому она и отказалась.



Сейчас мать осталась без всякой помощи. 1 ноября приезжали работники соцобеспечения и председатель сельсовета и сказали, чтобы мама продавала дом и переезжала жить в большую деревню, где кто-нибудь досматривал бы ее (в нашей осталось всего четыре души). И это говорят человеку, который еле передвигается по дому, не говоря уже про улицу.

Сам я за матерью не могу ухаживать, так как являюсь инвалидом 2-й группы и проживаю в Минске в квартире жилой площадью 38 квадратных метров вместе с женой, дочерью и ее семьей: мужем и тремя малолетними детьми, младшему из которых четыре месяца. Очень прошу вас помочь. Извините, что сумбурно написал. Весь на эмоциях.

С уважением –
Владимир ВЕЛИЧКОВИЧ,
инвалид 2-й группы, почетный донор.

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

К людям труда чиновники должны повернуться лицом

Я из поколения малолетних узников фашизма, инженер по образованию. В 1950-е годы мои ровесники, сменив своих матерей и отцов, активно восстанавливали из руин города, строили заводы и фабрики. Жили бедно, но людям труда везде были почет и уважение.

Сегодня другая жизнь. К сожалению, есть то, что радует, а есть и то, что огорчает. Со стороны властей не самое лучшее отношение к людям труда. Банкротятся предприятия, и многие остаются без нормальной работы, а значит, без нормальной зарплаты.

Главный бич и тормоз развития нашей экономики и независимого государства – это, считаю, безответственные чиновники. Такие имеются практически во всех структурах, они создали систему круговой поруки, волокиты, показухи, оградили себя кучами инструкций, ничего толком не решают, дискредитируют власть и подставляют президента. Зато пенсии у них – будь здоров какие! Не то что, скажем, у почетной гражданки г.Молодечно Л.Б.Князевой, создавшей патриотический клуб «Поиск» и за 30 лет со своими школьниками восстановившей более 2000 имен погибших в ВОВ и замученных в концлагерях.

Как грибы после дождя растут у нас разные «рублевки» с двух-трехэтажными коттеджами. Не пора ли супербогачам возвращать долги в госбюджет? На мой взгляд, нужно поднять налоги на сверхсобственность.

А взять ЖКХ – это неуправляемое государство в государстве. В старых, дырявых послевоенных домах доживает старшее поколение. На многочисленные обращения 70–80-летних граждан отписчики цинично советуют добиваться утепления домов через суд. А где наши деньги, которые мы все время исправно перечисляли в виде квартплаты, на ремонт и т.д.? Когда нам вернут банковские вклады, которые сгорели в 1990-е годы?

Как неравнодушного человека, меня волнует проблема трудоустройства молодых людей после окончания вузов. Оказавшись без работы по специальности, многие уезжают за границу.

Я возмущена многими передачами телевидения. Пустые сериалы, ток-шоу с семейными склоками…

Если, как сказал Лукашенко, мы строим государство для народа, так давайте, господа чиновники, думать о людях, а не только о себе. Наш трудолюбивый и очень терпеливый народ заслуживает гораздо большего уважения. Мы терпим, потому что не хотим Майданов.

Галина Евгеньевна ЖИГАЛЬСКАЯ,
жительница г.Молодечно.

ДЫСКУСІЯ

Вяртанне да Беларусі праз… трасянку

У «Народнай Волі» №83 за 19 кастрычніка 2018 года змешчаны артыкулы Алега Трусава, ганаровага старшыні ГА «Таварыства беларускай мовы імя Скарыны», «Крыху пра трасянку» і Міхася Скобы «Траянскі конь русіфікацыі». А пачалася гэтая дыскусія з артыкула Міхася Скобы «Шашаль мовы – трасянка» («Народная Воля» за 25 верасня 2018 г.). Адразу скажу, што я з вялікай павагай стаўлюся да абодвух аўтараў, набываю і чытаю іх кнігі. Ганаруся тым, што ў маёй хатняй бібліятэцы ёсць кнігі з іх аўтографамі. Я разумею трывогу Міхася Скобы за стан роднай мовы, але пазіцыя Алега Трусава мне бліжэй.

Я нарадзіўся, рос, вучыўся, калі беларускай мовай ужо была «наркамаўка», выбару не было. Тое, што існавала «тарашкевіца», я даведаўся напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Трэба адзначыць, што ў вясковай няпоўнай сярэдняй школе, у якой я навучаўся з 1944-га па 1951 год, усе прадметы выкладаліся на беларускай мове, і мы, дзеці, размаўлялі на роднай мове. Што тычыцца бацькоў, то і ў тыя часы ўжо былі такія, што размаўлялі па-руску, але на нас, дзяцей, гэта не надта моцна ўплывала. У 8–10-м класах я навучаўся ў раённым цэнтры – у г.п. Бягомль, што за 15 кіламетраў ад маёй вёскі. Вось там ужо ўсе прадметы выкладаліся па-руску. Беларуская мова і літаратура сярод суцэльнага рускамоўя былі амаль непрыкметныя.

Алег Трусаў у сваім лісце нагадаў, як у савецкім войску афіцэры кпілі з салдат-беларусаў за ўжыванне беларускіх слоў. Дадам, што кпілі не толькі з салдат. Напрыклад, мяне, курсанта ваеннага вучылішча, і не толькі мяне, дражнілі і афіцэры, і рускамоўныя курсанты. Працягвалася насмешкі з боку афіцэраў і тады, калі я сам ужо стаў афіцэрам. Хачу заўважыць, што асаблівая ўвага была скіравана толькі на беларусаў. Вы паспрабуйце сабе ўявіць, якой была руская мова ў салдат і афіцэраў – выхадцаў з Сярэдняй Азіі ці Каўказа. Але для іх гэта лічылася нармальным. Так што мне прыйшлося канчаткова развітацца з беларускай мовай.

І вось, адслужыўшы 27 гадоў вайсковай службы ў расійскіх рэгіёнах, у студзені 1982 года я вярнуўся на сталае жыхарства на Радзіму, у Мінск… і не пачуў ніводнага беларускага слова. Але мяне гэта не надта хвалявала. Я быў часткай савецкага народа, афіцэрскі склад у гэтым напрамку перавыхоўваецца вельмі хутка. І вось надышлі гарбачоўская Перабудова і Галоснасць. Я спецыяльна пішу з вялікіх літар, бо гэтыя з'явы таго вартыя. Пачалося абуджэнне грамадства. Пасля работы, а працаваў я пасля звальнення з войска вядучым інжынерам ваеннага прадстаўніцтва аднаго з заводаў Мінска, ехаў не дадому, а ў горад, каб пабачыць на свае вочы, што адбываецца на вуліцах і плошчах горада. Нарэшце мне пашанцавала – я трапіў на мітынг БНФ і тут пачуў беларускую мову і ўпершыню ўбачыў Бел-Чырвона-Белы Сцяг. Я стаў наведваццa ў Цянскую суполку БНФ г.Мінска. Марыў стаць там сваім, але гэтаму перашкаджаў моўны бар'ер. І вось мае пошукі прывялі мяне ў Таварыства беларускай мовы імя Скарыны. Але і тут я адчуваў сябе няўтульна – усё праз тую ж адсутнасць мовы. Што рабіць? І я звярнуўся да старшыні ТБМ Алега Трусава. Алег Анатольевіч даў мне слушную прапанову: «Не трэба баяцца размаўляць па-беларуску. Спачатку ў сказе хай будзе адно беларускае слова, праз нейкі час – ужо два, тры словы, і вы нават не заўважыце, як пяройдзеце на родную мову. Напачатку, можа, гэта будзе трасянка, а з цягам часу ўсё наладзіцца». Парады Алега Трусава мне вельмі дапамаглі, дадалі ўпэўненасці, што ў мяне ўсё атрымаецца. Вось чаму я не згодны з Міхасём Скобам. Для мяне трасянка – не шашаль мовы, а мост для пераходу ад «русского мира» да беларускага свету.

Што тычыцца спасылак Міхася Скобы на выказванні пра трасянку знакамітых паэтаў Беларусі, то гэта ўсяго толькі іх уласныя меркаванні, якія мы мусім паважаць. Мне пашчасціла тройчы сустракацца з Нілам Сымонавічам Гілевічам і размаўляць з ім. Ён спакойна слухаў маю трасянку. Мала таго, я ўручыў яму свой сшытак вершаў аб'ёмам у 400 старонак фармата А4. Вершы на рускай мове. Ён чытаў мае вершы каля трох месяцаў. Пры наступнай сустрэчы даў маім вершам высокую адзнаку, якой я вельмі ганаруся. Ніл Сымонавіч сказаў: «Спадар Ілля, у вашых вершах паэзіі ўвогуле няма, але змест вельмі добры, такое варта надрукаваць».

Двойчы ў мяне былі сустрэчы з Генадзем Бураўкіным. Я маю на ўвазе толькі тыя сустрэчы, калі мы былі адзін на адзін і ў нас адбыліся размовы на блізкія для абодвух тэмы. Другая сустрэча ў нас адбылася, калі ўжо выйшла ў свет мая кніга і прайшлі прэтэнтычныя пікеты ветэранаў каля будынка рэдакцыі «Народнай Волі». Генадзь Бураўкін даў мне слушныя парады, як трэба пісаць на вострыя тэмы, каб не чапляліся ўсялякія цэнзары. Трэба адзначыць, што ён таксама вельмі спакойна слухаў маю трасянку. А першая мая сустрэча з Бураўкіным адбылася на пахаванні пісьменніка Валянціна Тараса. Дарэчы, словы Валянціна Тараса сталі маім дэвізам. На прэзентацыі кнігі ўспамінаў пра Васіля Быкава «Наш Быкаў» Валянцін Тарас з трыбуны Дома літаратара сказаў: «Змагацца за Беларусь можна на любой мове».

Дзякуй «Народнай Волі» за тое, што дае магчымасць чытачам паўдзельнічаць на сваіх старонках у дыскусіях. Прабачце за трасянку, калі я яе не заўважыў і прапусціў. А героям майго ліста Алегу Трусаву і Міхасю Скобу зычу моцнага здароўя, новых творчых поспехаў, новых кніг і ўдачы ва ўсіх запланаваных справах.

Ілля КОПЫЛ, былы вайсковец.

РЭЗАНАНС

На свой аршын

Мяне закранула публікацыя ў «Народнай Волі» Віктара Дударонка «Калі вены здаровыя, не пашкоджаныя, ніводная медсястра не прамажа». Хочацца запярэчыць аўтару, абапіраючыся на канкрэтныя факты.

Неяк я лячыўся ў адным з аддзяленняў Баранавіцкай гарадской бальніцы. Крапельніцы нам ставілі розныя медсёстры па чарзе. У большасці з іх атрымлівалася выдатна. А ў некаторых – не так, як хацелася б.

Адна медсястра ўвяла мне іголку не ў здаровую вену, а побач з ёю. Неўзабаве я адчуў рэзкі боль. Побач з венай утварылася пухліна. Як я зразумеў, здарылася такое не з-за неналежнай кваліфікацыі медсястры, а з-за вымушанай спешкі, ва ўмовах якой ім даводзіцца працаваць па прычыне вялікай загружанасці. Улічваючы гэта, не стаў выказваць прэтэнзіі да дзяўчыны, а як мог суцяшаў яе – каб з-за разгубленасці не дапусціла яшчэ што-небудзь такое.

Кваліфікацыя малодшага медперсаналу павінна быць такой, каб незалежна ад таго, якія ў пацыента вены, выконваць згаданую працэдуру на належным узроўні. На жаль, пры ўсёй старанлівасці медсёстры не ўсім з іх гэта ўдаецца. У тым ліку і па згаданай мною прычыне. А Віктар Дударонак, як мне здаецца, бачыць прычыну ў іншым – у самім пацыенце: і вены ў яго, маўляў, кепскія, і вельмі многа ён патрабуе ад медыцыны.

Аўтар вышэйзгаданай публікацыі беспадстаўна абвяргае свайго апанента. Ён лічыць, калі яму даспадобы бальнічная ежа, то і ўсе астатнія пацыенты бальніцы павінны згаджацца з яго ным густам. Паводле яго меркавання, праблемы з харчаваннем у клініках выклікаюць… самімі пацыентамі: «дзе б яны ні былі, заўсёды будуць нечым незадаволены». А ў пацвярджэнне сваіх слоў дадае: «Са мной у палаце ляжыць васьмідзесяцігадовы чалавек. Яму ўсё не падабаецца. Не задаволены ён і дохтарам, і медсёстрамі, і санітаркамі». Паводле Дударонка атрымліваецца: калі яго гэта не тычыцца, дык астатнія павінны цярпець, маўчаць, не выказваць сваёй незадаволенасці.

Маўчым многія дзесяцігоддзі. І што маем?! Калі далей будзем арыентавацца на «дударонкаў», дык ніколі не пазбавімся язваў нашага быцця!

Міхаіл ЖУКАЎ,
ветэран працы савецкага часу.
г.Баранавічы.

ПРОТЕСТ

Кто мне ответит по существу?

Уважаемая редакция!

Как постоянный читатель «Народной Воли» решил написать о следующем.

С января 2018 года Пинская жилищно-эксплуатационная служба начала включать в жировку (квитанцию) плату за так называемые услуги по вывозу и обезвреживанию твердых коммунальных отходов. Я этими услугами не пользуюсь, так как живу в собственном доме. Отопление у меня печное. Бумагу и прочий мусор, который горит, сжигаю в топке печи или в плите. Пищевые отходы выношу на земельный участок в яму для компоста. Стекло, полиэтилен, макулатуру, железо сдаю в заготовительный ларек, который от моего дома в 150 метрах.

С заявлениями о самовольном, без договора на данную услугу удержании денег за вывоз, обезвреживание и переработку ТКО я обратился в местные органы власти, в Брестский облисполком, Министерство жилищно-коммунального хозяйства. Но все безрезультатно. Ответ один: все по закону.

27 июля 2018 года я письменно обратился в Генеральную прокуратуру Республики Беларусь, приложив ответ Министерства ЖКХ, с просьбой ответить мне, законно ли удерживают с меня деньги за вывоз ТКО. Но Генпрокуратура мое обращение переслала в то же Министерство ЖКХ, то есть тем, на кого я жалуюсь.

Согласно Конституции, генеральный прокурор и подчиненные ему прокуроры осуществляют надзор за точным и единообразным исполнением законов, декретов, указов и иных нормативных актов министерствами и другими подведомственными Совету министров Республики Беларусь органами. Кстати, прошло более месяца, а ответа из Министерства жилищно-коммунального хозяйства я не получил.



4 сентября 2018 года я опять обратился письменно в Генеральную прокуратуру: мол, почему руководство Минжилкомхоза не дало мне ответа? Но Генпрокуратура мое обращение опять переслала в Минжилкомхоз. Спрашивается: что за бюрократизм со стороны Генеральной прокуратуры? Неужели трудно ответить двумя словами – да или нет? Законно или незаконно удерживают с меня деньги якобы за вывоз мусора? Ведь мой мусор, как я уже сказал, никто никуда не вывозит. И я отказался подписывать договор.

Неужели этой проблемой должен заниматься президент страны?

Петр ХЛУС, житель Пинска.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
13 ЛІСТАПАДА 2018 г.

СТОП-КАДР

За Путина стыдно…

11 ноября 1918 года в лесу под французским городом Компьеном командующий войсками Антанты маршал Фердинанд Фош подписал от имени союзников соглашение о прекращении военных действий. Закончилась самая кровопролитная из войн, сотрясавших до той поры Европу. Война, в которой впервые массово были применены танки, военная авиация, химическое оружие. Война, которая унесла около десяти миллионов жизней солдат и около двенадцати миллионов – гражданского населения.

Позже, когда был подписан Версальский мирный договор, окончательно утвердивший поражение Германии и ее союзников, маршал Фош сказал:

– Это не мир. Это перемирие – лет на двадцать.

В той войне Россия, частью которой была тогда и Беларусь, могла оказаться среди победителей. Но Германия выделила золото на революцию. Большевики победили. Четыре империи рухнули: Австро-Венгерская, Российская, Османская и – Германская. Потом была попытка передела мира между наследниками выигравших и проигравших держав, которая обернулась Второй мировой войной со всеми последствиями.

Но окончание той, первой, мировой войны казалось тогда окончательной победой мира и разума. И сто лет спустя сегодняшние главы тех государств, которые участвовали в военных действиях 1914–1918 годов, встретились во Франции, чтобы еще раз заявить о хрупкости мира и о необходимости извлечь наконец уроки из кровавой истории человечества. Все стояли и ждали одного – посланца России.

Владимир Путин опоздал. Нарочно? Чтобы еще раз противопоставить себя всему миру? Нашел время и нашел повод? Грустно. Глупо. Стыдно. Мог оказаться с победителями, но – бездумно опоздал.

Александр Лукашенко не поехал в Париж, но отправил Михаила Мясниковича. Почему был избран такой вариант – не известно. Но известно, сколько крови было пролито на белорусской земле в ходе той войны, сколько наших соотечественников погибло, сколько беженцев было вынуждено покинуть свои дома…

Еще такой факт, вызывающий недоумение. Казалось бы, чего проще – возложить венки на могилу солдат, погибших в той беспощадной войне и похороненных в Минске? Тем более что мемориал есть – и за него не стыдно. Но никакой церемонии у нас не было.

Нужно помнить о войнах. Обо всех войнах. Обо всех жертвах. И только так можно избежать новых войн и новых жертв.

Федор КОНСТАНТИНОВ.



ТАМ, ЗА ОКЕАНОМ…

Выборы в США: «синяя волна» демократов не превратилась в цунами. Но изрядно потрепала Трампа

На самых напряженных за десятки лет выборах американские демократы получили большинство в Палате представителей Конгресса – впервые с 2010 года, а республиканцы укрепили контроль над Сенатом.

Американки идут во власть

Промежуточные выборы-2018 ознаменовались рекордным для США количеством кандидатов-женщин, и беспрецедентно многим из них удалось одержать победу.

Впервые в палату представителей попали женщины-мусульманки – Рашида Тлаиб в штате Мичиган и Ильхан Омар в Миннесоте.

В штате Нью-Йорк сенсационно победила 29-летняя латиноамериканка Александрия Окасио-Кортес (она станет самым юным конгрессменом-женщиной в истории), и впервые в конгресс прошли две женщины из индейских племен.

Также впервые губернатором избран открытый гей – Джаред Полис в Колорадо.

Предполагалось, что выборы могут превратиться в так называемую «синюю волну», которая захлестнет США, и традиционно республиканские (красные) территории проголосуют за демократов (синих). Так произошло в Вирджинии, где в одном из округов победила демократ Дженнифер Векстон (с 1980 года там неизменно выбирали республиканца).

Но цунами не произошло.

Демократы получили большинство в Палате представителей, но не в Сенате. Благодаря этому у них будет возможность блокировать законодательные инициативы Трампа. Демократы смогут инициировать расследования в отношении президента, требовать от него отчета о неоплаченных за последние 40 лет налогах и даже попробовать начать процесс импичмента – хотя последнее маловероятно.

Дональд Трамп, однако, бодр и не считает, что проиграл.

«От многих людей получил так много поздравлений с Большой Победой. Среди поздравивших были иностранные государства (друзья), которые за меня болели и надеялись заключить торговые сделки. Теперь мы все можем вернуться к работе и заняться делами!» – написал Трамп после выборов.

«Она заслужила эту великую честь…»

В какой-то степени выборы были референдумом о доверии Трампу. Согласно опросу, проведенному CBS, отношение к Трампу было решающим фактором при выборе кандидата для 65% избирателей.

В последние дни предвыборной кампании он приехал в важные для республиканских кандидатов в Сенат штаты, чтобы повлиять на избирателей. Похоже, его стратегия возымела успех в Индиане и Теннесси.

Если говорить в целом, штаты, поддержавшие Трампа на президентских выборах, сделали то же самое и сейчас.

Это были выборы, в которых по разные стороны баррикад оказались город и сельская местность, что еще раз демонстрирует раскол, который образовался в американском обществе.

Победа демократов в Палате представителей во многом обусловлена активностью образованных пригородов, которые в прошлом голосовали за республиканцев. Но из-за политики и высказываний Трампа многие жители решили голосовать против его партии.

7 ноября Трамп через «Твиттер» выразил уважение лидеру демократов в Палате представителей Нэнси Пелоси, которая из лидера меньшинства в январе, скорее всего, снова превратится в спикера: *"Если говорить напрямую, Нэнси Пелоси заслуживает, чтобы демократы выбрали ее спикером Палаты представителей. Если они заартачатся, возможно, мы подкинем голосов от республиканцев. Она заслужила эту великую честь!"*

Что будет дальше?

Республиканской партии, возможно, придется провести серьезную работу перед президентскими выборами 2020 года. Живущие в пригородах республиканцы с высшим образованием поддержали Трампа в 2016 году, хотя, возможно, без особого энтузиазма. Похоже, в этот раз они этого не сделали. Республиканцам придется подумать, как вернуть их доверие.

Можно выделить интересные аспекты в выборах губернаторов. Некоторые штаты, отдавшие подавляющее большинство голосов Трампу в 2016 году, на этот раз поддержали кандидатов от Демократической партии. Штат Иллинойс, в котором проживают 13 млн человек и в котором находится третий по величине город США – Чикаго, выбрал губернатора-демократа Джей Би Притцкера. В Канзасе союзник Трампа Крис Кобач намного отстал от победителя.

Но есть для Трампа и хорошие новости. Ярые сторонники президента стали губернаторами в Джорджии и Флориде, и эти штаты вполне могут поддержать его на президентских выборах в 2020 году.

Кандидаты от республиканцев также победили в Айове и Айдахо, которые считаются важными на выборах президента, поскольку могут склониться в сторону как республиканцев, так и демократов.

bbc.com

У НАС

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ…

Почему не выбрали Зася?

Александр Лукашенко 12 ноября провел встречу с Чрезвычайным и Полномочным Послом Азербайджана в Беларуси Латифом Гандиловым, сообщила пресс-служба белорусского лидера.

На встрече также была затронута тема саммита ОДКБ в Астане. Глава государства отметил, что его удивляют домыслы в некоторых СМИ по поводу основных тем, рассмотренных на этой встрече. «Какие бы там ни были рассуждения, а я отслеживаю средства массовой информации, особенно после ОДКБ, меня удивляют эти домыслы, рассуждения. Но мы виноваты сами, и наш МИД виноват в том, что мы достаточно четко и определенно не информировали журналистское сообщество, а через них – общество наших стран, по тематике переговоров ОДКБ и так далее. Я наблюдаю, что все свелось к тому, что мы якобы обсуждали только кандидатуру будущего руководителя ОДКБ. Да, мы обсуждали этот вопрос, но он занял у нас, наверное, 15 минут», – заметил президент.

«Основное время у нас занял первый вопрос – внешнеполитическая ситуация вокруг стран ОДКБ. Естественно, обсуждая, что происходит по периметру наших государств, мы коснулись и внутриполитической ситуации, но исключительно с подачи того или иного президента. Никто там не собирался вмешиваться в те или иные процессы. К примеру, Никол Пашинян: 9 декабря выборы в парламент, он затронул эту тему, мы послушали, – рассказал глава государства. – У нас прошел ряд мероприятий: Мюнхенская конференция (встреча Основной группы), форумы регионов с Украиной и с Россией, и я затронул эти темы, все, что происходит вокруг, как это отражается на внутриполитической ситуации. Президенты послушали, приняли к сведению. Точно так и другие президенты проинформировали, что происходит внутри страны. И здесь нет никакой чрезвычайщины».

Касательно назначения нового руководителя аппарата ОДКБ Александр Лукашенко отметил: «Естественно, вариантов было много. И это не значит, что мы ущемили Армению, что кто-то победил, кто-то проиграл. Вопрос в том, что Никол Пашинян должен просто в правительстве разобраться с ситуацией, потому что эта страна сегодня возглавляет ЕАЭС, наш экономический союз, и ОДКБ – очень большая нагрузка на страну, которая находится в таком переходном периоде. И справится ли Армения? Если Никол Пашинян разберется и даст нам ответ, это будет в Санкт-Петербурге». Президент подчеркнул, что решение в спокойном русле будет принято на запланированной на 6 декабря встрече.

Что касается ротации руководителя данной организации, то следующая страна по алфавиту Беларусь. «У меня на сегодня три кандидатуры, которые я могу предложить на должность генерального секретаря ОДКБ», – заявил глава государства.

ГАНЬБА!

«Павінны ж быць у чалавека мазгі!..»

Рэзананс на выступленне беларускага спевака Дзмітрыя Калдуна ў Данецку

Днямі ў самаабвешчанай і амаль нікім не прызнанай Данецкай Народнай Рэспубліцы прайшлі выбары так званага кіраўніцтва. На канцэрце, прысвечаным галасаванню, выступіў мінчанін **Дзмітрый Калдун**.

Той самы Калдун, які атрымаў вядомасць пасля перамогі на расійскім пеўчым шоу "Фабрика звезд-6" і дасягнуў самага лепшага выніку Беларусі на "Еўрабачанні", калі ў 2007 годзе заняў шостае месца. Тады за Дзмітрыя без перабольшання перажывала ўся Беларусь.

А што зараз?

На мінулым тыдні высветлілася, што Калдун пагадзіўся выступіць у ДНР. Прычым інфармацыя з'явілася за некалькі дзён да "выбараў" і выклікала лавіну асуджэння, у першую чаргу ў сацыяльных сетках. У Дзмітрыя быў час адмяніць выступленне, але ж ён гэтага не зрабіў! Ягонае фота на данецкай сцэне ўжо з'явілася ў інтэрнэце: стоячы ў чорным паліто, спявак выконвае нейкую кампазіцыю.



Дарэчы, выступленне Калдуна ў Данецку выглядае яшчэ больш дзіўным і незразумелым, ведаючы, што адзін з яго дзядуль паходзіць родам з Украіны – з Запарожжа. Цяпер падобна на тое, што ўезд ва Украіну для спевака будзе закрыты.

Грошы не пахнуць?

"Народная Воля" папрасіла пракаменціраваць выступленне Калдуна ў Данецку некаторых вядомых беларусаў.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, паэт:

– Вы ж згадайце, як Дзмітрый Калдун пачынаўся. Пачынаўся ён у Расіі, адтуль "ішоў". Таму я не стаў бы тут казаць пра нейкую нацыянальную свядомасць у гэтага чалавека. Ён – прадукт расійскіх менеджараў. Гісторыя, канечне, ведае выпадкі, калі, пабываўшы ў Маскве, беларусы разумелі, што, там і тут – розныя краіны, але выпадак з Калдуном відавочна не той. Увогуле, тое, што ў сучасным грамадстве называецца "папсой", не ўтрымлівае ніякага нацыянальнага складніка.

Нікому не прыйшло і не прыйдзе ў галаву назваць "папсой" "Песняроў", таму, быў бы жывы Мулявін, наўрад ці ён выступаў бы ў сённяшнім Данецку. Калдун і Мулявін – непараўнальныя па велічыні постаці. Таму ўлічваючы маштаб асобы Калдуна, тут асабліва няма чаго і каменціраваць…

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, палітык, "віртуальны сябра" Дзмітрыя Калдуна:

– З аднаго боку, можна было б сказаць, што ў чалавека мусіць быць выбар, але ў гэтым выпадку – вельмі дрэнны выбар. Я не думаю, што недзе ўнутры, Калдун – апантаны прыхільнік ДНР. Таму тут выпадае казаць пра іншае – грошы не пахнуць. Але гэтыя грошы з пахам крыві… Здавалася б, Калдун не самы бедны беларус, а ягонае выступленне ў Данецку – вялікая ляпёшка, у якую ён уступіў. І пах ад гэтага выступлення адпаведны.

Віктар ШАЛКЕВІЧ, бард:

– У кожнага чалавека павінны быць у галаве мазгі. Хаця б для таго, каб думаць, што ён робіць. Па-мойму, не ён адзін ужо туды ездзіў. Чаго ён туды паехаў? За грашыма? Мне здаецца, што гэтым учынкам Калдун падсек сабе кар'еру. Справа не ў тым, што грошы не пахнуць, справа ў іншым: няўжо мала нармальных месцаў, дзе можна выступіць? Навошта, як свіння, гразь шукаць?..

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ГОЛАС НАРОДА

«Гэта канец яго кар'еркі»

Карыстальнікі інтэрнэту некалькі дзён абмяркоўвалі выступленне спевака ў акупаваным Данецку. Прыводзім самыя красамоўныя і толькі цэнзурныя каментары, якія пакідалі людзі на асабістай старонцы Дзмітрыя Калдуна ў "Фэйсбуку".

Serhii Darvinskyi: *Деньги не пахнут, Дима, да?*

Василий Андреев: *Надо же – Луганск, Донецк и другие террористические ДНР/ЛНР – легко посещает Дмитрий Колдун.*

А вось якую рэакцыю выклікала ў карыстальнікаў інтэрнэту сама навіна пра выступленне Калдуна ў Данецку:

Vadzim Tumanau: У яго беларускае толькі грамадзянства.

Николай Вишневецкий: Где кормят, там и лижет зад. Какой он белорусский, Родина и где родился – понятия очень разные. Продал уж давно...

Ольга Козуб: Желание заработать напрочь отбивает мозги...

Мікола Качурэц: Не наракайце на артыстаў і курваў, яны служаць любой уладзе.

Александр Мелешко: Он что, идиот?

Сергей Цвирко: Это конец его карьерки.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 ЛІСТАПАДА 2018 г.

ПАМЯТЬ

Жизнь – минное поле

7 ноября исполнилось 95 лет со дня рождения Александра Дракохруста. К сожалению, уже 9 лет его нет рядом с нами.



Нет прекрасного военного журналиста, хорошего писателя, жизнь которого оказалась сплошным минным полем. И взрывов на нем было не счесть. Начало им положил тот, самый первый, – в 1937 году в Борисове, где жила семья высокого военачальника Абрама Дракохруста. Об этом роковом дне Александр Абрамович вспоминает в своей книге «Негаснущие зарева»:

«17 июля 1937 года. Примерно в полдень в дверь нашей квартиры громко и требовательно постучали. Открыв ее, я в первый момент решил, что к нам нежданно-негаданно нагрянули гости. Тем более что прямо перед собою я увидел знакомое лицо Лорика Борисовича, папиного приятеля, чекиста из Минска, который часто и всегда без предупреждения заваливался в наш дом, любил выпить, сыграть партию-другую.

Да и других военных и штатских, переминавшихся на лестничной площадке, я хорошо знал – сколько раз бывали они у отца, начальника политотдела танковой бригады. Через час нежданные «гости», а вернее чекисты, перевернули в квартире все вверх дном. И увели отца. Навсегда… И на долгие годы разделили с матерью».

Той «взрывной волной» подростка Сашу занесло в Одессу к дальней родственнице семьи Дракохруст. Она и спасла его от ГУЛАГа, где обычно оказывались дети репрессированных родителей.

Уже с первыми залпами войны его, семнадцатилетнего, призвали под ружье и по иронии судьбы определили в саперы, в тот род войск, в котором вся его служба превратилась в сплошное минное поле. Он ползал по нему, обезвреживая вражеские мины и прокладывая путь нашим танкам и пехоте при наступлении. Под бомбежками и артобстрелами, к тому же в ледяной воде наводил переправы и строил мосты.

Все, что было им пережито в годы войны, в течение многих лет не давало поэту покоя. Воспоминания осмысливались и изливались в сборниках поэзии.

Боец Красной Армии Александр Дракохруст никогда не сомневался в честности и невиновности своих родителей и перед народом, и перед Советской властью. Для себя он давно решил, в чем корень зла. Подтверждение своих мыслей и рассуждений он потом найдет в следующих строчках Александра Твардовского:

А было так: сапожник родом
Встал на высокий пьедестал.
И стал народ врагом народа,
А он один народом стал.

Отзвук этих размышлений мы читаем в строчках, в которых боец Дракохруст сочувствует своему товарищу по несчастью:

Мне не забыть бюро у брода
И эти честные глаза.
Плевать, что сын врага народа!
Ребята, голосуем «за»!

И вся его поэзия военных лет лишена ура-патриотической фальши. В ней мы не найдем строк о том, как бойцы или политруки перед атакой выкрикивают имя тирана, который накануне войны обезглавил армию, репрессировав почти всех видных военачальников, что привело к массовым тяжелым поражениям в первые месяцы, и сгноил в лагерях миллионы ни в чем не повинных советских людей.

Мы слышим в стихах поэта совсем иную риторику в бою, иные надрывные голоса:

Крестил комбат с отчаянным надсадом
И в мать, и в бога наш залегший взвод,
Хватал за плечи – мол, вперед, ребята!
Просил:
– Вперед!.. Иначе – перебьет…
Но мы лежали, в насыпь вжавшись плотно,
В горячих комьях вспоротой земли.
Умолк сержант. За грудь
схватился взводный.
А мы никак подняться не могли.
Упала,
шею вытянув,
граната.
Разрыв. И стон. И пена на губах.
И наша Катька, ППЖ комбата,
Вскочила:
– Гады! Вы трусливей баб!..
И только шаг, и только вскрик
короткий…
И в нас, парнях,
переборола страх
девчонка эта в выцветшей пилотке,
В зеленых – из брезента – сапогах.
А мы ее, признаться,
звали шлюхой.
Но все бы там погибли, у высот…
Рыдал комбат. Гудели взрывы глухо.
А из пробитой сумки капал йод…

Поэзия Александра Абрамовича не лишена личных переживаний, его отношения к событиям, участником которых он был. Он их глубоко осмысливал и только потом излагал на бумаге, как в этом стихотворении:



Беларускія пісьменнікі М. Аўрамчык, В. Быкаў, А. Дракахруст, У. Караткевіч у перапынку паміж пасяджэннямі Пленума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. г. Мінск. 16 лютага 1972 г. Фота Уладзіміра Крука.

Я падал камнем, я вставал, как штык,
Спал на ходу и бредил в медсанбате.
Я в суть вещей под бомбами проник,
И жизни смысл мне стал тогда
понятен.
Лишь одного никак не мог понять,
Долбя могилы у разбитых дзотов,
Что люди могут просто умирать
И просто жить без бомб и
артналётов.

Я много лет не слышу вой свинца.
Я всяко жил: и хорошо, и худо.
Я поседел и все же до конца
Не смог понять простое это чудо.

Война всю жизнь оставалась для поэта негаснущим заревом. Именно так он и озаглавил одну из книг своих воспоминаний. Войну поэт показывает такой, какая она есть в своей сути: страшной, жестокой, где человеческая жизнь – одна лишь пылинка на огромном кровавом месиве. К тому же она требует от этого самого человека нечеловеческих физических и моральных сил:

Остервененье ближнего боя,
Рукопашная вразнотык –
Белый глаз,
сопля над губою
и проколотый в горле крик...
О, как душу мне изувечило
в том бою на исходе дня
это дело
нечеловечье:
я – его
или он – меня!..

И когда нынче в пьяном бреду зеленые юнцы орут «Мы готовы повторить – вперед на Берлин!», им хочется напомнить, как это было. А ветеран Второй мировой поэт Александр Дракохруст хорошо знал, как это было. И именно к ним, к живущим в третьем тысячелетии, обращался, открыто свидетельствуя, что он и его поколение были заложниками судьбы. Их вылавливали в тайге. Их, загнанных режимом за колючую проволоку, выметали из лагерей и гнали на фронт. А там то гитлеровцы, то смершевцы очередями выкашивали. Словом, ветеран предупреждает наследников: подумайте, во что обошлась война стране и народу, сколько миллионов жертв она потребовала…

Мне особенно памятна встреча с Александром Абрамовичем у него на квартире на улице Калиновского. Тогда я приехал к нему за рекомендацией в Союз белорусских писателей. За журнальным столиком за чашкой кофе мы долго беседовали о дне насущном и о роли в нем литераторов-оппозиционеров Бородулина, Буравкина, Некляева, Законникова и других. Я был искренне удивлен, насколько глубоко он, русскоязычный писатель, знает белорусскую литературу. И не просто знает, а и постоянно следит за проявлением писателями их гражданской позиции.

Я, помню, тогда спросил у Александра Абрамовича:

– Что вас с Дальнего Востока потянуло в Беларусь после той страшной трагедии, которую в 1937-м тут, в Борисове, пережила ваша семья?

Он задумался, а потом произнес фразу, которую осмысливал, видимо, уже долгие годы:

– *Понимаете, Слава* (ко мне он обращался только на «вы»), *эти три книги своей прозы я мог написать только тут, где произошла та давняя трагедия. Мне было проще окунуться в те трагические события и воссоздать их по памяти. К тому же здесь многие знали и помнили моих родителей.*

А на Дальнем Востоке я оказался неслучайно. После победы над фашистской Германией меня вместе с моим саперным взводом с Западного фронта перебросили на Восточный фронт против Японии. Так что и там еще были минные полосы.

Когда после смерти жены Дины он остался один, казалось, что минное поле переместилось к нему в квартиру. И каждый раз, когда раздавался телефонный звонок из Праги или из Вильнюса, он шел к телефону, как по минному полю, с тревожным волнением в сердце, с ожиданием если не «взрыва», то неутешительных вестей. Ведь в Праге на радиостанции «Свобода», которая противостояла по всем позициям белорусскому режиму, активным штыком был его сын Юрий. А в Вильнюсе нашел приют Независимый институт социально-экономических и политических исследований его сына Олега, изгнанный из Беларуси за то, что не давал покоя властям, показывая реальное падение их рейтинга ниже плинтуса.

Именно в те годы Александр Абрамович и подвел итог своей планиды:

Какую жизнь я прожил
И теперь
в совковых генах страхи
обнаруживаю.
То кажется – опять стучатся
в дверь,
То кажется – опять меня
подслушивают.
И снова жизнь трясет меня без
жалости,
мол, выбирай: тюрьма или сума…
О, сколько нужно мужества и
в старости,
чтоб выдержать и не сойти с ума!

Он выдержал. И остался с нами своей поэзией, полной ненависти к войне и насилию.

Александр Дракохруст умер 14 ноября 2009 года.

Вячеслав ВОЛЬСКИЙ.

ГІСТОРЫЯ ФОТАЗДЫМКА

Як у 90-я гады праводзілі беларусізацыю арміі

1992 год. У цэнтры фота – тагачасны міністр абароны **Павел Казлоўскі,** справа ад яго – народны паэт Беларусі **Ніл Гілевіч.**



“На пачатку 90-х, калі краіна стала незалежнай, было вырашана зрабіць армію беларускамоўнай, – успамінае Павел Паўлавіч. – *Гэтае пытанне само па сабе напрошвалася, бо ўжо быў прыняты Закон аб беларускай мове. У звязку з гэтым было вырашана, што і беларускае войска павінна стаць беларускамоўным. На калегіі я ўзняў гэтае пытанне, прынялі пастанову, згодна з якой на працягу двух гадоў беларуская армія павінна была перайсці на беларускую мову. У першую чаргу гэта тычылася працы афіцэрскага складу. У штабах і часцях ствараліся спецыяльныя групы па вывучэнні роднай мовы, арганізоўваліся розныя семінары і сустрэчы. Падчас адной з такіх сустрэч да афіцэраў і быў запрошаны наш знакаміты паэт Ніл Сымонавіч Гілевіч, які распавядаў пра нашу гісторыю і нацыянальную культуру”.*

Былы міністр абароны кажа, што атрымліваў у свой адрас шмат крытыкі за беларусізацыю арміі, але заставаўся на сваёй пазіцыі.

“Меркаваў так: калі ў нас незалежная краіна, то павінна быць і сапраўды беларуская армія, – дадае Павел Казлоўскі. – *Акрамя таго, прынялі рашэнне, каб прысяга прымалася таксама на роднай мове. Гэтую ініцыятыву падтрымалі старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч і прэм’ер-міністр Вячаслаў Кебіч, мы вырашылі прывесці да прысягі войска на беларускай мове 31 снежня 1992 года. Да гэтага часу зацвердзілі ў Вярхоўным Савеце тэкст прысягі, і ўсё прайшло па плане. Прысягу прынялі нават міністры, а таксама Шушкевіч з Кебічам.*

У той жа час меркавалі, што некаторыя афіцэры адмовяцца прысягаць другі раз, бо, маўляў, ужо давалі прысягу пры Саюзе. Таму вялі тлумачальныя гутаркі, і пры гэтым было абвешчана: хто не жадае прысягаць беларускай арміі, можа без праблем перавесціся ў любую іншую армію краін былога Саюза. На роздум у людзей было амаль паўгода. Але, шчыра вам скажу, з’ехалі толькі адзінкі. Мяркую, што ўсё мы тады рабілі правільна”.

Пасля таго як Аляксандр Лукашэнка быў абраны прэзідэнтам краіны, быў прызначаны і новы міністр абароны – Анатоль Кастэнка.

“Усе нашы праекты па беларусізацыі арміі на гэтым, можна сказаць, і закончыліся, – кажа Павел Казлоўскі. – *Новая ўлада выбрала свой курс, дзе беларускай мове адводзілася другасная роля. А новая каманда Міністэрства абароны з радасцю гэты курс падтрымала”.*

Алесь СІВЫ.

КАНТРАБАНДА

47 кілаграмаў наркотыкаў на беларускай мяжы

12 лістапада беларускія мытнікі затрымалі грамадзяніна Расіі, які ў аўтамабілі спрабаваў правезці на тэрыторыю нашай краіны наркотыкі – каля 47 кг гашышу і 200 г какаіну. Пра гэта паведаміў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрый Сянько. Паводле яго слоў, наркотыкі ўвозіліся праз мяжу Беларусі з Еўрасаюзам і прызначаліся для расійскага рынку. Старшыня ДМК таксама не выключыў, што наркотыкаў можа быць і больш – гэта выявіцца пасля дэталёвага абследавання затрыманага аўтамабіля спецтэхнікай.

ФАКТ

4-миллионный пассажир…

«В Национальном аэропорту Минск был обслужен 4-миллионный пассажир с начала 2018 года. Им оказался пассажир рейса №B2861/HY7709 Минск–Прага авиакомпании «Белавиа», – заявили вчера в аэропорту, отметив при этом, что год назад аэропорт обслужил 4-миллионного пассажира более чем на месяц позже – 19 декабря.

ЧУЛІ?

Знойдзена пахаванне паўстанцаў 1863 года?

Пахаванне, якое знаходзіцца ў ваколіцах вёскі Ішчална Шчучынскага раёна, лідскі краязнаўца Леанід Лаўрэш выявіў… у архівах Вроцлава.

Разбіраючы архівы колішняга ўладальніка Ішчалны Караля Лясковіча, Леанід знайшоў цікавы дакумент.

“На адлегласці 1,5 км ад Стрэліцы, у паўночна-ўсходнім накірунку (так у тэксце, рэальна – у паўночна-заходнім накірунку. – **Аўт.**) *знаходзілася адзіная ў гэтай мясцовасці шляхецкая ваколіца Станкевічы. Паміж дваром і ваколіцай меўся высокі курган з крыжам на вяршыні – помнік 1863 года. Тут была супольная магіла паўстанцаў, палеглых у сутычцы з казакамі”.*

Дарэчы, дакумент датуецца 1971 годам.

Лідскія актывісты ГА “Таварыства беларускай мовы” арганізавалі экспедыцыю ў раён Станкевічаў і Стрэліцы. **Сяргей Пантус** адзначае, што ў пазначаным на мапе раёне яны з лёгкасцю адшукалі знойдзены ў запісе курган за поймай рэчкі Голдаўка.

– *Мы проста выйшлі на поле за Станкевічамі і адразу ўбачылі курган у даліне рэчкі Голдаўка,* – згадвае Сяргей. – *Адзінае – не знайшлі той крыж, пра які гаварылася ў дакуменце.*

Як выявілася пазней, у Станкевічах адзін мужчына сталага веку добра памятае, як старэйшыя людзі распавядалі пра паўстанцаў і казалі, што тут знаходзіцца іх магіла. Праўда, ён не змог узгадаць, ці стаяў крыж на кургане.

Станіслаў Суднік, удзельнік экспедыцыі, распавёў легенду, якую пачуў ад мясцовых жыхароў. Паводле яе, існуючая дагэтуль на могілках у Станкевічах капліца была збудавана паўстанцамі за адну ноч у памяць аб іх загінуўшых сябрах. Дарэчы, капліцу нядаўна адрэстаўрыравалі, і зараз яна знаходзіцца ў добрым стане.

Паводле вынікаў экспедыцыі сябры ТБМ звярнуліся ў Лідскі райвыканкам з просьбай дазволіць аднавіць крыж на месцы пахавання паўстанцаў 1863 года.

З райвыканкама прыйшоў адказ: маўляў, тых звестак аб падзеях, якія адбыліся ў гэтых мясцінах у 1863 годзе, што былі прадстаўлены, недастаткова для прыняцця рашэння аб аднаўленні крыжа. Чыноўнікі пішуць, што Лідскаму гісторыка-мастацкаму музею даручана правесці дадатковую даследчую працу для пацвярджэння гэтых звестак, і калі факт захавання паўстанцаў будзе ўстаноўлены, то пытанне аб аднаўленні крыжа разгледзяць дадаткова.

Міхал КАРНЕВІЧ.



На здымку: курган блізу вёскі Станкевічы, дзе знаходзіцца мяркуемая магіла паўстанцаў 1863 года.

Народная Воля http://www.nv-online.info 13 ЛІСТАПАДА 2018 г.

ЗЕМЛЯКІ

«У архівах сямейных легенд захаваўся адрас...»

Пра падрыхтоўку да Міжнароднага форуму «Беларусы свету на Байкале», раскол паміж землякамі Іркуцка і пра тое, чаму праз 100 гадоў нашы людзі зноў пераязджаюць у Сібір, расказвае старшыня Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага Алена СІПАКОВА (на фота).



Пляцоўка для знаёмстваў

Нядаўна ад сяброўкі ў «Фэйсбуку» з Іркуцка Алены Сіпаковай атрымала паведамленне: «Кацярына, я ў Мінску! Хачу сустрэцца-пагутарыць».

З думкай, наколькі ўсё ж сацыяльныя сеткі спрыяюць развіццю стасункаў, сціраюць межы і значна палягчаюць жыццё, еду на сустрэчу з землячкай. У прыватнай бяседзе (але пад уключаны дыктафон) даведваюся: сёлетні прыезд спадарыні Алены ў Мінск звязаны з падрыхтоўкай да форуму «Беларусы свету на Байкале». І хоць пройдзе ён у жніўні будучага года ў Іркуцку, з патэнцыяльнымі партнёрамі ды ўдзельнікамі мерапрыемства дамовы трэба заключаць ужо сёння. Сярод тых, хто падтрымаў ідэю, – Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, Таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма», Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», этнаграфічныя клубы, а таксама асобныя фалькларысты і музыканты.

Гэтыя дамоўленасці, растлумачвала Алена Сіпакова, патрэбны ёй для напісання падрабязнага сцэнарыя форуму і атрымання гранта на яго правядзенне. Думаю, у суайчынніцы ўсё зладзіцца. Тым больш што злёты беларусаў свету на Байкале становяцца традыцыйнымі. Першая такая сустрэча прайшла ў 2015 годзе.

– *Вельмі хочацца, каб як мага больш было ўдзельнікаў з Беларусі,* – сказала Алена. – *Мы, беларусы замежжа, калі адрываемся ад Радзімы, шмат страчваем. Адчуваем патрэбу, каб нас падбадзёрылі беларускасцю. А Байкал – такое асаблівае месца, дзе адбываюцца цуды. Калі нешта добрае там ладзіцца, яно падпітваецца энергіяй прыроды, узмацняецца, праз час дае свае вынікі. Думаю, форум «Беларусы свету на Байкале» абавязкова стане месцам для знаёмстваў і наладжвання кантактаў паміж землякамі з розных краін, у тым ліку і прадпрымальнікаў.*

Сібірачка беларускага паходжання

Алена Сіпакова – беларуска ў Сібіры ажно ў чацвёртым пакаленні. У канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя перабраліся з тагачаснай Магілёўскай губерні ў Іркуцкую вобласць яе прабабуля і прадзядуля. Як тысячы беззямельных сялян, ехалі яны па лепшую долю. А там абяцалі: колькі захочаш зямлі, столькі і возьмеш. Дарэчы, хваля перасяленняў 1920–1930-х гадоў не першая. Самай масавай лічыцца міграцыя пачатку ХХ стагоддзя – па сталыпінскай рэформе. Аднак яшчэ да яе Сібір «асвойвалі» хадакі, якія самастойна адпраўляліся ў шлях, каб знайсці лепшае месца пад сонцам.

– *Спачатку прабабуля і прадзядуля пасяліліся ў вёсцы Мяцёлкіна Заларынскага раёна, якую заснавалі «сталыпінцы», выхадцы з Магілёўшчыны,* – згадвала сямейную гісторыю Алена. – *Пасля жылі ў Новамяцёлкіна. А ў сувязі з тым, што ў тых месцах знайшлі радовішча графіту, жыхароў перасялілі ў вёску Марыінск. Там ужо і мая маці нарадзілася. Сёння, на жаль, гэта сяло вымірaючае. З «нашых» там толькі адзін мамін стрыечны брат застаўся. У Новамяцёлкіна я была апошні раз у 2015-м на сустрэчы выпускнікоў школы, ад якой там – толькі фундамент. Цікава, што амаль усе з былых вучняў лічаць сябе беларусамі. А ў вёсцы той толькі тры хаты, і ў адной з іх жыла бабулька 1930-га або 1929 года нараджэння, дачка першых перасяленцаў.*

Зямлю беларусам, як абяцалі, далі. І яны, шчаслівыя, працавалі на ёй з асаблівай апантанасцю. Так, што многім у 1930-я пагражала раскулачванне. Ледзь не трапіў пад рэпрэсіі і прадзед Алены. Але яго брат, які быў старшынёй калгаса, своечасова папярэдзіў: «Навум, уступай у калгас, а то ўначы за табой прыедуць...»

А вось з якой вёскі Беларусі з'ехалі родныя, Алена дакладна не ведае. Аднак у архівах сямейных легенд захаваўся адрас: вёска Слаўня, Быхаўскі павет Магілёўскай губерні. Яго называюць і іншыя жыхары сібірскіх сёл Марыінск і Новамяцёлкіна... На сучаснай карце краіны дзве вёскі з такой назвай: адна знаходзіцца на мяжы Магілёўскай і Гомельскай абласцей, другая – на Гомельшчыне.

– *Калі арыентавацца па тых жаночых строях, што засталіся ад перасяленцаў (адзін ад хадакоў – заснавальнікаў вёскі Марыінск, другі належыць сям'і, якая пераехала ў Сібір у 1930-я гады), то нашы продкі з'ехалі з вёскі Слаўня, што на мяжы Магілёўскай і Гомельскай абласцей,* – дзялілася высновамі Алена Сіпакова. – *Але я да той Слаўні яшчэ не даехала. Гэта ў планах чарговага майго падарожжа па Беларусі.*

Дарэчы, Алена Сіпакова ўпершыню пабывала на радзіме продкаў у 2001 годзе, калі ўдзельнічала ў экспедыцыі студэнцкага этнаграфічнага таварыства па адным з раёнаў Беларусі. Пасля былі з'езды беларусаў свету 2009, 2013 і 2017 гадоў, стажыроўкі на творчых курсах для кіраўнікоў грамадскіх аб'яднанняў суайчыннікаў замежжа, удзел у фестывалях мастацтваў беларусаў свету і Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Зоў Палесся», шмат чаго іншага.

У пошуках лепшай долі ў Сібір і сёння пераязджаюць беларусы

Увогуле кажуць, што ў Сібіры жывуць каля 350 тысяч выхадцаў з Беларусі. І большая частка з іх – нашчадкі перасяленцаў з самай беднай вобласці краіны Магілёўскай, далей – з Гомельскай, Віцебскай, Мінскай...

– *Зразумела, ехалі ад беднасці,* – удакладніла Алена Сіпакова. – *Дабіраліся ў цяплушках, абозамі, пешшу. Першую зіму, бабуля расказвала пра сваіх бацькоў, зімавалі ў зямлянках. Па вясне ўжо будавалі хаты. Талакой: дапамагалі адзін аднаму. І не абы-якія ўзводзілі, а дыхтоўныя, прыгожыя... Паказальная ў гэтым плане вёска Тургенеўка, што ў Баяндаеўскім раёне Іркуцкай вобласці. Дагэтуль там захаваліся хаты пачатку і сярэдзіны мінулага стагоддзя.*

Што цікава, перасяленне працягваецца і сёння. Нядаўна далучылася да Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага сям'я Лабароў, якая два гады таму пераехала ў Іркуцк з горада Крычава Магілёўскай вобласці. На новым месцы жыхарства яны адкрылі салон прыгажосці, збіраюць грошы на кватэру. Да іх хутка збіраецца пераязджаць і бабуля.

Вельмі актыўная ў новых сяброў суполкі дачка Аляксандра.

– *Саша Лабар узначаліла маладзёжнае крыло арганізацыі. У мяне на яе вялікія спадзяванні,* – прызнаецца Алена Сіпакова. – *Дзяўчынка і танчыць, і спявае. Гэта сапраўдная знаходка для нас, яна скончыла музычную школу, аддзяленне харэаграфіі, пераможца шматлікіх творчых конкурсаў. Аляксандра актыўна ўключылася ў дзейнасць суполкі, і яе лідарства я падтрымліваю. Мы стварылі гурток па традыцыйных побытавых і сучасных танцах. З сяброўкамі Саша ладзіць майстар-класы па танцах для моладзі, у тым ліку і ў беларускіх вёсках раёна і вобласці.*

Летам актывісты таварыства здзейснілі праект «Беларускія вёскі Прыбайкалля», у трох сёлах Іркуцкай вобласці праводзілі краязнаўчыя конкурсы, майстар-класы па традыцыйных рамёствах, ладзілі выставы мастацка-прыкладной творчасці. Так, пабывалі ў буйнейшай на сённяшні дзень беларускай вёсцы Андрушына Куйтунскага раёна, сёлах Жызнёўка Заларынскага раёна і Чарчэт Кайшэцкага раёна. І ўсюды да ўдзелу ў прэзентацыях беларускай культуры Алена Сіпакова прыцягвала моладзь.

На наступны ж год у планах кіраўніцы таварыства адправіць маладых актывістак у летнік «Беларусь», які штогод праходзіць у Верхнядзвінску, якраз на мяжы трох дзяржаў – Беларусі, Расіі і Латвіі – і збірае ўдзельнікаў з розных краін.

– *Саша, ведаю, пасля школы збіралася ехаць у Маскву вучыцца ў Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных,* – сказала Алена. – *Але тата яе адгаварыў: будзе паступаць у інстытут чыгуначнага транспарту ў Іркуцку на спецыяльнасць «мытная справа». І я радуюся: на 4–5 гадоў дзяўчына застанецца з намі. Я і так у апошні час страціла ажно пяць актывістаў: пераехалі ў Санкт-Пецярбург. Што казаць, там перспектыў болей...*

Чаму беларус беларусу ў Іркуцку – не брат

Закранулі мы ў гутарцы з Аленай і балючае для яе пытанне – разлад з заснавальнікам і былым кіраўніком Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага Алегам Рудаковым.

– *Я змяніла Алега на пасадзе старшыні таварыства па дамоўленасці з ім жа,* – згадвае Алена. – *Было гэта ў 2012 годзе. Да нашай суполкі прыбіліся нейкія неадназначныя асобы, называлі сябе язычнікамі. А чырвонай лініяй у дзейнасці суполкі заўсёды былі і ёсць народныя абрадавыя святы, іх яны вельмі цікавілі. І вось у час Міжнароднага лагера «Байкал-2020», у якім удзельнічалі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, з'явіўся дзіўны хлопец. Ён быў у чорных джынсах, на спражцы папругі – нямецкі арол, шынель са свастыкай на рукаве і ў... беларускай кашулі. Яго ўсе фатаграфавалі. А пасля былі вобыскі ў нашым офісе, у кватэры Алега... А ў нас справаздачна-выбарчы сход праз некалькі дзён: абралі мяне старшынёй, каб нікога не правакаваць. Алег мяне сам угаворваў стаць кіраўніком. Дагэтуль жа я была намеснікам, і мне гэтага хапала. Я і сёння ўпэўнена, што кіраваць павінен мужчына, а жанчына – займацца пытаннямі культуры, наладжваць сувязі з грамадскасцю, прымаць гасцей. У нас жа дзелавы свет мужчынскі, і поспех – за моцнай паловай чалавецтва. Таму абвінавачванні, што я «падсядзела» Алега, – несправядлівыя. Я хоць заўтра саступлю яму месца, калі ён вырашыць вярнуцца. Алег Рудакоў – гэта сапраўды асоба, велічыня, імя яго вядома далёка за межамі Іркуцка і Беларусі. Цяпер Алег у складзе рады Іркуцкага беларускага клуба «Крывічы». Яны шмат чаго цікавага робяць. Аднак дзейнасць дзвюх беларускіх арганізацый горада ніяк не перасякаецца. На вялікі жаль!*

Сэрцайкам жа Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага з'яўляецца сёння сямейны вакальны ансамбль «Лёнушка». Выступаюць у ім мастацкі кіраўнік гурта Таццяна Сіпакова, маці Алены, сама Алена і яе сястра Кацярына. А ў рэпертуары трыа ў асноўным тыя песні, якія прывезлі шмат гадоў таму з сабой у Сібір продкі-перасяленцы.

Кацярына МЯДЗВЕДСКАЯ.

АРТ-ПАДЗЕЯ

«Ток» Рыгора Сітніцы

У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася персанальная выстава Рыгора Сітніцы пад назвай «Ток».



Сёлета пад гэткай жа назвай выйшла ў свет кніга вершаў творцы, прэзентаваная на шматлюднай вечарыне ў Белдзяржфілармоніі. *«Я доўга не думаў, як назваць сваю выставу. Ток крыві, ток часу, ток – месца, дзе людзі збіралі ўмалот. Я выбраў тое, што найбольш характарызуе мяне як мастака, і паказваю людзям, што я «намалаціў»,* – патлумачыў Рыгор Сітніца на адкрыцці выставы. Графіка мастака прызнана ў свеце, ён удзельнік шматлікіх замежных арт-праектаў, а з 2013 года ўзначальвае Саюз мастакоў Беларусі.

Ася РОКАЧ.

КОНТАКТЫ

Немецкий язык как ключ в новый мир

9 ноября 1989 года пала Берлинская стена, что положило начало объединению страны. В ознаменование этого события Посольство Федеративной Республики Германия в Беларуси отмечает десятилетие значимой образовательной инициативы своего государства – школ PASCH.

Десять лет назад по инициативе Федерального министерства иностранных дел и еще нескольких государственных организаций Германии по всему миру была создана образовательная сеть ПАШ (PASCH) – «Школы: партнеры будущего». В чем ее суть? С помощью современного учебного материала, повышения квалификации учителей, школьных обменов и стипендий инициатива поддерживает средние учебные заведения во всем мире, которые квалифицированно изучают немецкий язык. А его сегодня учат более чем 600.000 учащихся от Афганистана до Кипра. Надо заметить, что немецкий является родным языком для самого большого количества людей в Европе, так как является государственным не только в Германии, но и в Австрии, Швейцарии, Люксембурге и Лихтенштейне. Не говоря о том, что его считает родным значительная часть населения Северной Италии, Восточной Бельгии, Нидерландов, Дании, Восточной Франции и даже части Польши, Чехии и Румынии.

Глобальная цель инициативы ПАШ – пробудить интерес к Германии. Это намного больше, чем просто уроки языка. В дальнейшем многие выпускники ПАШ поддерживают контакт друг с другом, и эти всемирные связи обеспечивают им доступ к немецким вузам и компаниям, уменьшают национальные предубеждения и даже меняют привычки питания. Словом, хорошее знание этого языка предопределяет в дальнейшем жизненный путь многих молодых людей.

В Беларуси школы – партнеры ПАШ особенно тесно сотрудничают с Институтом имени Гёте в Минске и Центральным управлением школ за рубежом. Все школы – партнеры ПАШ (а их сейчас более 2000 по всему миру) образуют всемирное образовательное сообщество, которое связано с Германией.

Сегодня и завтра в Минске в Республиканском театре белорусской драматургии состоится театральный фестиваль, посвященный юбилею ПАШ-инициативы. Несколько театральных групп из Беларуси и Литвы после интенсивных репетиций с носителями языка покажут свои постановки на немецком языке.

Виктория ДРОЗД.

ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА

Кніга пра Рамана Скірмунта

Выйшла ў свет аб'ёмнае (700 старонак) даследаванне доктара гістарычных навук Алеся Смаленчука «Раман Скірмунт. Жыццяпіс грамадзяніна Краю».



Раман Скірмунт – знакавая постаць беларускай гісторыі першай паловы ХХ стагоддзя. Ён быў дэпутатам Дзяржаўнай Думы і Дзяржаўнага Савета Расійскай імперыі, падчас Першай сусветнай вайны актыўна далучыўся да беларускага руху. У 1917 годзе ўзначаліў Беларускі нацыянальны камітэт у Мінску, у 1918-м стаў прэм'ер-міністрам БНР, як мог адстойваў нацыянальныя інтарэсы беларусаў пасля падпісання Рыжскага міру. Р.Скірмунт быў забіты невядомымі ў вёсцы Парэчча на Піншчыне ў 1939-м, пасля прыходу «вызваліцеляў» з усходу.

Антон ЗАГОРСКІ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Равуцкая за кратамі

Паўтара месяца таму была затрымана начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя **Людміла Равуцкая**. Яе абвінавацілі ў атрыманні хабару. Прэс-служба Следчага камітэта паведаміла, што чыноўніца з 2015-га па 2018 год неаднаразова прымала матэрыяльныя каштоўнасці і набывала выгоды маёмаснага характару за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, якія ўваходзяць у яе кампетэнцыю.

Тады некаторыя СМІ паспяшаліся звязаць гэтае затрыманне з так званай «справай медыкаў», якую вядзе КДБ Беларусі. Як вядома, яшчэ ў чэрвені Камітэт дзяржаўнай бяспекі абвясціў, што выкрыў маштабную карупцыйную схему ў сферы аховы здароўя, якая тычыцца закупак медыцынскага абсталявання і лекаў, па справе затрыманы некалькі дзясяткаў чалавек. У іх лік трапілі чыноўнікі, з якімі, безумоўна, у працэсе сваёй работы кантактавала Людміла Равуцкая. Гэта і ўжо былы намеснік міністра аховы здароўя **Ігар Ласіцкі**, і экс-старшыня «Белфармацыі» **Вячаслаў Гніцій**, і былы дырэктар «Белмедтэхнікі» **Аляксандр Шарак,** і іншыя. Аднак у КДБ тады заявілі, што затрыманне начальніка ўпраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя да «справы медыкаў» дачынення не мае.

Але зараз ізноў у медыцынскіх колах з'явіліся чуткі, што быццам бы справу ДАРЭЧЫ

Камітэт дзяржбяспекі.

"Следчы камітэт працягвае расследаванне гэтай справы, – абвергла слухі афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта **Юлія Ганчарова**. – *Раней агучаная інфармацыя застаецца актуальнай".* А гэта значыць, што па-ранейшаму ў дачыненні да Людмілы Равуцкай абрана мера стрымання ў выглядзе заключэння пад варту.

ДАРЭЧЫ

«Без каментарыяў»

А ці з'явіліся новыя падрабязнасці па «справе медыкаў», напрыклад, ці закончана расследаванне ў дачыненні да некаторых падазроных, калі справы будуць перададзены ў пракуратуру, калі пачнуцца першыя суды? Хто з медыкаў застаецца пад вартай, а хто адпушчаны пад хатні арышт альбо падпіску аб нявыездзе? Як вядома, напрыклад, былы галоўны ўрач Мінскай абласной бальніцы **Андрэй Каралько** ўжо ўладкаваўся на працу, а былы дырэктар РНПЦ траўматалогіі і артапедыі акадэмік **Аляксандр Бялецкі,** былы галоўны ўрач 1-й Гарадской бальніцы Мінска **Алег Фамін** застаюцца ў СІЗА КДБ. Аднак у Камітэце дзяржбяспекі на гэты конт нічога не кажуць. «*Пакуль без каментарыяў*», – сказаў афіцыйны прадстаўнік КДБ **Андрэй Яраш**.

Марыя ЭЙСМАНТ.

РЭГІЁН

У Гродне з'явіцца свой анкадыспансер

Дзеля гэтага плануюць рэканструяваць клінічную бальніцу №3.

Паводле праекта генеральнага плана, прадугледжана рэканструкцыя існуючых будынкаў клінічнай бальніцы №3, якая зараз займае тэрыторыю плошчай 2,6 гектара, а таксама будаўніцтва новых карпусоў. На месцы былой бальніцы маюць намер пабудаваць адзіны комплекс, дзе збіраюцца абслугоўваць насельніцтва не толькі Гродна, але і ўсёй вобласці.

Анкалагічны дыспансер разлічаны на 312 ложка-месцаў, наведвальнасць – 300 чалавек у дзень. Плануецца, што ён будзе налічваць восем карпусоў, у тым ліку два лячэбныя, корпус з аперацыйным блокам, радыелагічны, лабараторна-дыягнастычны, анкадыспансернае аддзяленне, блок клінічных кафедраў, паталагаанатамічны, а таксама пансіянат.

Зараз гродзенскія ўлады запрашаюць гараджан узяць удзел у грамадскім абмеркаванні праекта анкадыспансера.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ЗВАНЫЙ ГОСТЬ

Страсть и месть всегда идут рядом

*За обсуждением непростого пути оперы Рихарда Штрауса «Саломея» на сцену Большого театра Беларуси мы как-то совсем упустили из виду артистов. А это команда настоящих профессионалов, ансамбль великолепных голосов. Партию Саломеи на премьерных спектаклях исполнила солистка театра **Екатерина ГОЛОВЛЕВА.** Сейчас это ведущая певица театра, сильный и красивый голос позволяет ей исполнять огромный репертуар, порой она выходит на сцену по четыре-пять раз в месяц.*



Но в «Саломее» Екатерина превзошла себя: ее сопрано «поразило кристальной чистотой интонации, девической свежестью звука» – и в данном случае я цитирую московских критиков, чьи отзывы не замедлили появиться в московской прессе сразу после белорусской премьеры. Певица находится в расцвете карьеры, с этим трудно не согласиться.

– Прежде всего, как вы пережили период после внезапного переноса премьеры «Саломеи» на полтора месяца? Ведь чувство обиды могло захлестнуть...

– Оно и захлестнуло. Бывает, передвинули – и хорошо, а здесь так выкладывались, работали такой сплоченной командой, что это ударило по людям. Как муж сказал: «Получились роды в два захода».

– Саломею теперь можно отнести к вашим любимым партиям?

– Да, конечно! Многогранный образ, особенно в трактовке Панджавидзе. Не уверена, что мне было бы приятно играть, если бы финал был с отрубленной головой Иоканаана – безобразной, отвратительной сценой, когда женщина, упоенная страстью, не выбирает приемов для мести.

– Опера оставила впечатление материала цельного, яркого. Как вы выдержали два труднейших спектакля подряд? Конечно, это говорит о вашей сильной вокальной подготовке.

– Было трудно, но прежде всего морально, эмоционально. Наш первый спектакль получился более рассудочный: из-за переноса премьеры исчез кураж, нам трудно было снова собраться в пружину, чтобы выстрелить. Второй, по-моему, прошел удачнее с драматической точки зрения. Зато теперь определенная пауза до декабря. Надо дать отдых мозгам, да и голос должен быть в определенных гигиенических рамках. В сентябре и октябре я выходила на сцену по четыре-пять раз – это неправильно. Хотя мне привычно. На гастролях и не такие нагрузки случаются.

– «Саломея» – вызов для творческой карьеры, согласны?

– Да, с точки зрения самого материала. Но не могу сказать, что это запредельно сложная партия с точки зрения вокала. Конечно, опера заставляет много думать. Потому что как только ты перестаешь думать, ты выключаешься. Как компьютер. Далеко не везде еще в партии удалось найти тонкие интонационные грани. Музыка Рихарда Штрауса очень многогранная, символическая. Интеллектуальная музыка.

– Были трудности с немецким языком?

– Были, потому что я его не знаю. В театр, чтобы помогать певцам с немецким, приезжал коуч Аксель Эйверарт, профессор из Нидерландов. Он сам когда-то пел Ирода в «Саломее». Мне пришлось фактически выучить немецкий, чтобы понимать, о чем пою. Потому что абракадабру не запомнишь.

– Где вы учились, откуда вы?

– Училась в Московской консерватории, мне от дома до учебы было всего 40 минут. Потом работала в Большом театре Москвы. Там мы с Михаилом Александровичем и познакомились.

– А потом муж перевез вас за собой в Минск и, можно сказать, подпортил карьеру?

– Почему? Я с удовольствием приехала в Беларусь. Большой театр России сам по себе для меня закончился. Туда пришел новый дирижер, новая администрация, репертуарная политика стала другой, она изменилась на манер западной системе «стаджионе», когда спектакли прокатываются сериями по десять-пятнадцать дней и на них специально приглашаются артисты со всего мира. Основная труппа работала очень мало, мы выходили на сцену два-три раза в год. Штатные солисты оказались в изоляции. И когда мужу предложили работу в Минске, я прежде всего посмотрела афишу белорусского Большого, а это – ого, весь мировой репертуар! Я абсолютно не жалею о переезде.

– Тем более что в Минске у вас родилась дочка. Наверное, поэтому вы первое время довольно редко выходили на сцену?

– Но не из-за беременности и родов, поверьте. У меня просто не было такой возможности.

– Как это? Жене главного режиссера не давали возможности петь?

– Вот и вы, интеллигентный, кажется, человек, а тоже мыслите штампами. Почему если жена главного режиссера, то она не хорошая певица, а выходит на сцену, потому что поет по блату? Мой статус жены имеет значение для тех, кому надо оправдать свои собственные неудачи. А мы как раз хотели избежать этого узла: певица-жена. Потому что, работая в Москве и зная театральную ситуацию изнутри, мне по-человечески претило использование административного ресурса мужа.

– Но исподволь он все равно действует... Разве нет?

– Нет. Это действует махровый штамп и только в местечковом сознании. И в результате столичный театр превращается в провинциальный.

– А что такое провинциализм?

– Это раздача орденов самим себе. Замкнутость, боязнь влияния извне и при этом мания величия. Мы, например, в семье всегда обсуждаем мои выступления: что еще надо сделать? Только благодаря критике и контролю происходит развитие артиста. К слову, в Москве, когда я там работала, обычно следили за качеством вокала. Каждый раз после спектакля разбирали выступления, и не важно, народный ты или заслуженный. И это правильно, потому что мы со стороны себя по-настоящему не слышим. Певцы опираются лишь на внутренние ощущения и могут ошибаться. И ошибаются! И только профессионал со стороны помогает. Мне – мой муж, Михаил Александрович Панджавидзе. Да и сама я не витаю в облаках. За всю мою жизнь не было ни одного спектакля, чтобы я аплодировала самой себе: «Браво! Я звезда!» Эти слова вообще первый шаг к деградации.

– Да, вам повезло: и муж, и коуч, и главный режиссер.

– Когда я выходила за него замуж, Михаил был стажером. А я – уже солисткой Большого. А теперь нашему браку почти 20 лет, и сколько вместе исколесили городов, сколько вместе работали на постановках!.. Мы всем занимаемся вместе, вплоть до айкидо. Миша в свое время вел даже занятия в группе.

– Режиссер Панджавидзе и айкидо?!

– Да, у него черный пояс, первый дан – если кто-то знает, что это такое. И я занималась айкидо, мне очень нравилось.

– Вон с каким багажом у нас певица работает... Хотела еще вот что спросить: как вы решились через много лет на второго ребенка?

– Бог послал. Мне всегда хотелось девочку, но не складывалось. И потом, я думала, что в моем возрасте это не может сложиться. Зато теперь очень счастлива – вторая молодость.

– Не страшно было, что придется оставить сцену на несколько лет?

– А я и не оставляла почти – ни с первым, Сережей, ни с нашей второй, Александрой. На восьмом месяце беременности дочкой я пела «Тоску», и пела как никогда. Единственно, дышать трудно. И после родов быстро вышла на сцену. Иногда, правда, очень спать хотелось.

– Ну, быть вашей дочке артисткой!

– А это нам ясно с первых лет. Саша ставит домашние спектакли, причем так строго гоняет отца, когда тот думает, что можно сделать вполноги, чтобы отвязаться. Сразу замечание: «Неправильно! Повтори, папа, еще раз!»

– Характер, однако! Но хочу сделать комплимент вашему танцу «Семи покрывал» в «Саломее». Вы в нем очень пластичны. Впрочем, это и до Саломеи отмечалось публикой.

– Еще бы с мужем-режиссером не научиться двигаться! В спектакле танцы поставили Юлия Дятко и Константин Кузнецов. Юля ждала ребенка, была на последних месяцах. Прямо как я с когда-то с Сашей. И когда они с мужем вышли на премьере на поклон, их родившаяся к премьере девочка ждала их в кулисах. Мы еще шутили, что надо вынести было и ее, потому, что она тоже принимала участие в постановке танцев вместе с мамой!

Конечно, фантазии талантливых людей нет предела. Но есть предел постановочным средствам. Было бы больше денег, сделали бы спектакль еще зрелищнее. Но, перефразируя Ролана Быкова, можно сказать, что любой спектакль – это кладбище режиссерского замысла.

Елена МОЛОЧКО.

«ЛІСТАПАД»

ФИПРЕССИ погрозило пальчиком белорусскому Минкульту...

Закончился юбилейный XXV Минский международный кинофестиваль «Лістапад». Гран-при «Золото «Лістапада» за лучший фильм жюри отдало ленте «Мне плевать, если мы войдем в историю как варвары» (Румыния, Чехия, Франция, Болгария, Германия) румынского режиссера **Раду Жуде,** причудливой по форме и весьма смелой, местами провокационной по содержанию, если учесть, что в нем поднимается тема Холокоста. Грань между игровым и документальным повествованием здесь едва различима.

Лучшим режиссером нынешнего форума стал китайский режиссер **Цзя Чжан-Кэ,** неоднократный призер фестивалей в Каннах, Венеции и Берлине. В этом году в Минске он представлял гангстерскую драму «Пепел белоснежен». Исполнительнице главной роли в этом фильме красавице **Чжао Тао** досталась награда «За лучшую женскую роль». Приз «За лучшую мужскую роль» получил **Степан Девонин** (российский фильм «Сердце мира»).

Когда пришло время раздавать призы за игровые фильмы в номинации «Молодость на марше», жюри этой номинации от имени ФИПРЕССИ (Международная федерация кинопрессы) зачитало протест против давления Министерства культуры Беларуси на отбор кинофильмов в Национальный конкурс. В этом году в знак протеста несколько молодых режиссеров даже сняли свой фильмы с конкурса. Зал поддержал заявление ФИПРЕССИ долгими аплодисментами. Кстати, среди публики был и министр культуры **Юрий Бондарь**. К сожалению, его реакцию рассмотреть не удалось.

В Национальном конкурсе победила короткометражка **Мары Тамкович** «Отец». Режиссер учится в Варшавской киношколе, которая и дала основную сумму средств на фильм своей студентке. В фильме поднимается тема абортов – а в Польше, как известно, они запрещены даже после изнасилования. Но следующее кино, призналась Мара, она хочет снять в Беларуси и о Беларуси.

Виктория ДРОЗД.

АСОБА

Аляксандр МЯДЗВЕДЗЬ:

«Працу ва ўніверсітэце я пакінуў прынцыпова...»

Легендарны беларускі барэц, які не так даўно адзначыў сваё 81-годдзе, рассказаў «Народнай Волі», чаму сышоў з кафедры фізвыхавання Беларускага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, дзе працаваў працяглы час.



– Зараз займаюся са спартсменамі ў Школе вышэйшага спартыўнага майстэрства, – *кажа трохразовы алімпійскі чэмпіён.* – І вынікі, трэба сказаць, неблагія. Напрыклад, мой вучань Уладзіслаў Андрэеў у гэтым годзе заваяваў бронзу на чэмпіянаце Еўропы. Даволі перспектыўны хлопец, хаця была сур'ёзная траўма, рабілі аперацыю на плячы, таму на Алімпіяду ён не патрапіў. Але веру: усё ў яго яшчэ атрымаецца.

– Аляксандр Васільевіч, а чаму вы пакінулі кафедру? Столькі ж год там працавалі…

– Гэта было прынцыповае рашэнне. Справа ў тым, што кіраўніцтва ўніверсітэта прыняло рашэнне адмяніць бясплатнае харчаванне для спартсменаў, якія займаліся ў нас. Дык калі ёсць людзі, якім нічога не патрэбна, то чаму я павінен разам з імі працаваць? Таму сказаў «да пабачэння» і сышоў. А працы ў мяне і так хапае. Пакуль ёсць магчымасць, буду дапамагаць спартсменам чым магу.

– Здароўе яшчэ дазваляе?

– Дзякуй Богу, трымаюся. Час ад часу трапляю ў шпіталь на планавае абследаванне, але паляжу некалькі дзён пад кропельніцамі – і зноў за працу. Праца – стымул для жыцця!

Алесь СІВЫ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Вадзім САШУРЫН:

«Рыхтаваць сваіх не хочам альбо не ўмеем»

Вядомы біятланіст распавёў, ці можа краіна зарабіць на правядзенні этапа Кубка свету і што свеціць беларускай зборнай у бліжэйшы час.



Як паведамлялася раней, Міжнародны саюз біятланістаў прыняў рашэнне, што адзін з этапаў Кубка свету па біятлоне ў 2022 годзе пройдзе ў беларускіх Раўбічах – з 26 лютага па 6 сакавіка. У наступным годзе тут таксама адбудзецца чэмпіянат Еўропы і чэмпіянат свету па летнім біятлоне.

Кіраўніцтва спарткомплексу рапартуе, што аб'ект пасля маштабнай рэканструкцыі гатовы прымаць спаборніцтвы такога ўзроўню.

– Этап Кубка свету па біятлоне – гэта, безумоўна, падзея для краіны, – кажа **Вадзім Сашурын.** – Права на яго правядзенне вельмі складана атрымаць, калі хто не ведае. Адзінае, што мяне насцярожвае, дык гэта магчымасці беларускіх біятланістаў. Галоўнае пытанне: што нашы спартсмены пакажуць на гэтым этапе?

– Чаму краіне складана атрымаць права правядзення такіх спаборніцтваў?

– Усе квоты заранеі распісваюцца. У дадатак глядзяць на інфраструктуру, стопрацэнтную гарантыю наяўнасці снегу. Улічваючы, што на пачатку сакавіка, калі будзе праходзіць этап, надвор'е можа быць непрадказальным, то снег, як я разумею, падрыхтуюць пра запас.

Хаця не сумняваюся, што ўсё пройдзе на самым высокім узроўні. Ёсць жа вопыт правядзення чэмпіянату свету, Еўропы. Па колькасці гледачоў мы можам, безумоўна, прайграць Германіі, хаця цікавасць да гэтай знакавай падзеі ўсё роўна будзе вялікая. Усё-такі біятлон – гэта не бокс і не веласпорт…

– Беларусь можа зарабіць на правядзенні этапа Кубка свету?

– Безумоўна, але патрэбны разумны маркетынг. Прыбытак можна атрымаць і ад рэкламы, і ад продажу білетаў. Але, як мне падаецца, грошы – другасная справа. Усё-такі на першым месцы – папулярызацыя віду спорту.

– Біятлон папулярызуем, а сёння трэнеры не ведаюць, каго ў зборную браць. Ды і ў вас, як бачу, песімістычны настрой…

– У мяне ўжо дастаткова даўно такі настрой з-за таго, як развіваецца біятлон у Беларусі. І, натуральна, пасля сыходу з вялікага спорту Дар'і Домрачавай і Надзеі Скардзіна аптымізму на дадалося.

– А як вы ставіцеся да таго, што ў зборную запрасілі шмат спартсменаў з Расіі?

– Няхай скажуць дзякуй, што гэтым спартсменам не далі двухгадовую забарону на выступленне за беларускую каманду. Тая ж беларуска Дар'я Блашко, якая змяніла грамадзянства на ўкраінскае, якраз-такі і не мае права два гады выступаць на афіцыйных спаборніцтвах за нацыянальную зборную Украіны.

А ўвогуле, гэта звычайная практыка беларускіх спартыўных чыноўнікаў – запрасіць расіян, а сваіх адсунуць убок. І гэта ў такой сітуацыі, напэўна, адзінае правільнае рашэнне, бо расійскія спартсмены прыходзяць з гатовай базай. А сваіх рыхтаваць, відаць, альбо не хочам, альбо не ўмеем.

– Могуць у нас вырасці новыя Дар'і Домрачавы?

– Чаму б і не? Пытанне толькі ў тым, колькі год давядзецца чакаць…

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ФУТБОЛ

Каму бронза, а каму серабро?



За два туры да фінішу чэмпіянату Беларусі па футболе абвастрылася барацьба за другое і трэцяе месцы.

Вось вынікі матчаў 28-га тура: «Гарадзея» – «Дынама» (Брэст) – 1:0, «Дынама» (Мінск) – «Слуцк» – 2:0, «Іслач» (Мінскі раён) – «Віцебск» – 0:1, «Гомель» – «Мінск» – 0:2, «Нёман» (Гродна) – «Смалявічы» – 1:1, «Тарпеда» (Мінск) – «Днепр» (Магілёў) – 3:0, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) – «Прамень» (Мінск) – 0:0.

Турнірнае становішча

Каманды	Гульні	Выйгрышы	Нічыі	Паражэнні	Мячы	Ачкі
БАТЭ	27	22	3	2	49–18	69
Дынама (Мн)	28	16	9	3	35–17	57
Віцебск	28	17	5	6	43–19	56
Шахцёр	27	16	7	4	36–14	55
Тарпеда-БелАЗ	28	15	6	7	32–16	51
Дынама (Бр)	28	13	9	6	49–30	48
Нёман	28	11	7	10	29–28	40
Слуцк	28	11	3	14	26–33	36
Гарадзея	28	8	7	13	29–32	31
Мінск	28	7	9	12	33–36	30
Гомель	28	7	6	15	15–33	27
Іслач	28	6	9	13	16–35	27
Тарпеда	28	6	6	16	20–36	24
Смалявічы	28	5	8	15	20–36	23
Прамень	28	4	11	13	22–39	23
Днепр	28	3	7	18	15–47	16

P.S. *Матч «Шахцёр» (Салігорск) – БАТЭ (Барысаў) перанесены на 21 лістапада.*

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ
9 772071 964000 18090

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 12.11.2018 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 23 010 экз. Заказ № 4088.